23-ці ДЗЕНЬ МЕСЯЧНІКА ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ І САМАПРАВЕРКІ

Асьвея злачынна недаацэньвае ручной ільнаўборкі

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гарному Каму ністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 217 (4122)
Серада 12 жніўня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

Заваяваць вышыні тэхнікі

Бурны рост сацыялістычнай прамысловасьці на базе найноўшых тэхнічных дасягненьняў ва ўсю шырыню ставіць задачу аўладаньня тэхнікай.

Нават той вялізарны тэхнічны вопыт, які набыты рабочай клясай на працягу мінулых год сацыялістычнага будаўніцтва, ня можа задаволіць гігантскіх, узросшых запатрабаваньняў нашай прамысловасьці.

Узровень тэхнічных ведаў рабочых мас, рады якіх усё больш папаўняюцца новымі кадрамі з калгасаў і вёсак, у значнай меры адстае ад тэмпаў тэхнічнага пераўзбраеньня сёньняшніх фабрык і заводаў.

Гэта адставаньне з асаблівай сілай выявілася тады, калі былі пушчаны новыя, тыпу Сталінградзкага трактарнага заводу, прамысловыя гіганты. Нізкі ўзровень тэхнічнай падрыхтаванасьці рабочых — гэта біч прэмфінпляну, у ім карэняцца прычыны шматлікіх паломак, папсуцьцяў і нават выхаду са строю надзвычай каштоўнага замежнага абсталяваньня.

Прамысловыя гіганты, пабудаваныя паводле апошняга слова тэхнікі, высокаякаснае абсталяваньне, новыя агрэгаты, цэхі, новыя прынцыпы арганізацыі працы патрабуюць высокакваліфікаваных кадраў, новых прыёмаў работы.

«Тэхніка ў перыяд рэканструкцыі вырашае ўсё».

Гэты гістарычны лёзунг, высунуты правадыром партыі, стаў моцным рухавіком. Пад гэтым лёзунгам партыйная арганізацыя, гаспадарнікі, рабочыя масы разгарнулі вялікую барацьбу за аўладаньне тэхнікай, за ўкараненьне найноўшых тэхнічных дасягненьняў капіталістычнага сьвету ў практыку сацыялістычнай будоўлі, за перабудову кіраўніцтва і ўсёй работы па-новаму.

Злучэньне перадавой капіталістычнай тэхнікі з шырока разгорнутымі камуністычнымі мэтадамі працы дало ўжо вялікія перамогі.

Гігантскімі крокамі наперад пасунулася рабочае вынаходніцтва. Пралетарская сьмялкова, бальшавіцкая настойлівасьць у злучэньні з адданай работай соцень спэцыялістаў дала відавочныя бліскучыя вынікі. Мы маем савецкія блюмінгі, крэкінгі, камбайны, друкарскія машыны і інш.

Аднак, каб поўнасьцю забясьпечыць сваячасовы пуск новых гігантаў, каб ЦАЛКАМ асвоіць складанае абсталяваньне, мала сьмялкі, асобных людзей, мала тэхнічнай узброенасьці, усё яшчэ невыстарчальнай колькасьці інжынэраў і тэхнікаў. НАМ ПАТРЭБНЫ ТЭХНІЧНА-ПІСЬМЕННЫЯ МАСЫ РАБОЧЫХ.

Пастаўленая партыяй задача — ЛІКВІДАВАЦЬ ТЭХНІЧНУЮ НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ сярод шырокіх рабочых мас, задача стварэньня ТЭХНІЧНАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ З ЛЮДЗЕЙ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ, падрыхтоўкі непасрэдных работнікаў прамысловасьці — ня можа быць вырашана ТОЛЬКІ праз навучальныя ўстановы.

МАСАВАЕ РАЗГОРТВАНЬНЕ ТЭХНІЧНАЙ ПРАПАГАНДЫ ПАВІННА СТАЦЬ МАГУТНЫМ ВАГАРОМ У ЗМАГАНЬНІ РАБОЧЫХ МАС ЗА АЎЛАДАНЬНЕ ТЭХНІКАЙ, ЗА АСВАЕНЬНЕ ТЫХ НОВЫХ УМОЎ РАЗВІЦЬЦЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ЯКІЯ ТАК ДАСКАНАЛА АКРЭСЬЛЕНЫ Ў ПРАМОВЕ ТАВ. СТАЛІНА.

У БССР задача павышэньня ўзроўня тэхнічных ведаў рабочых, разгортваньня тэхнічнай прапаганды з надзвычайнай настойлівасьцю дыктуецца асаблівымі ўмовамі прамысловасьці, якая мела цяжкую спадчыну царызму, і ў мінулым мела крайнюю тэхнічную адсталасьць.

У апошняй пастанове ЦК УсеКП(б) вызнавана цэлы рад практычных мерапрыемстваў, якія ў шырокім маштабе ставяць задачу разгортваньня тэхнічнай прапаганды і яе арганізацыі.

Пастанову ЦК УсеКП(б) трэба адразу перакінуць на фабрыкі і заводы, растлумачыць рабочым яе сутнасьць, уключыць масы ў актыўнейшую барацьбу за ажыцьцяўленьне данай ЦК УсеКП(б) праграмы аўладаньня тэхнікай.

Гэтая праграма павінна стаць сьцягам баявых дзеяньняў кожнай партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай арганізацыі, кожнай гаспадарчай і культурна-асьветнай установы.

Белдзяржвыдавецтва, Радыёцэнтр, Белдзяржкіно, дзейнасьць якіх даволі ярка адлюстроўвае наша адставаньне ў барацьбе за аўладаньне тэхнікай — павінны праявіць найбольшую настойлівасьць, гібкасьць у разгортваньні тэхнічнай прапаганды.

НА СЁНЬНЯ ПРАДУКЦЫЯ БДВ НЕ ЗАДАВАЛЬНЯЕ ПАТРЭБ НАВАТ НА ЭЛЕМЭНТАРНЕЙШУЮ ТЭХНІЧНУЮ ЛІТАРАТУРУ. БЕЛДЗЯРЖКІНО НЕ ДАЛО НІ АДНЭЙ ДОБРАЙ КІНО-ХРОНІКІ, (НЕ ГАВОРАЧЫ АБ ФІЛЬМАХ) ПА ПЫТАНЬНЯХ ТЭХНІКІ. БЕЛРАДЫЁЦЭНТР ТАКСАМА ВЫПУСЬЦІЎ З ПАД УВАГІ ПЫТАНЬНЕ ТЭХНІЧНАЙ ПРАПАГАНДЫ.

У рабоце гэтых устаноў у першую чаргу павінен быць створан КАРЭННЫ пералом.

Кожная партыйная ячэйка, кожны камуніст павінны быць АРГАНІЗАТАРАМІ масавага руху рабочых за аўладаньне тэхнікай.

Неабходна ў найбольшай меры выкарыстаць вопыт перадавых партыйных арганізацый па аўладаньні тэхнікай.

«У гэтым сьвятле вялікае значэньне мае, праведзеная на Сталінградзкім трактарным заводзе, спэцыяльная партыйная канфэрэнцыя па тэхніцы. Партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя канфэрэнцыі па тэхніцы, якія праводзяцца на заводах, па вытворчых аб'яднаньнях і гапіках гаспадаркі, павінны стаць сустаўной часткай масава-тэхнічнай прапаганды, сустаўной часткай мабілізацыі мас на барацьбу за тэхніку» («Правда»).

Патрэбна ў найбольшай меры прыцягнуць да кансультацыі па тэхнічных пытаньнях, да кіраўніцтва тэхнічнымі гурткамі наяўны склад інжынэраў і тэхнікаў, уключаючы і замежных спэцыялістаў, якія працуюць на нашых фабрыках і заводах.

Трэба стварыць такія ўмовы, пры якіх спэцыялісты былі-б зацікаўлены ў разгортваньні тэхнічнай прапаганды і маглі праяўляць сваю ініцыятыву і самадзейнасьць у гэтай важнейшай галіне нашай работы.

Для таго, каб паставіць справу аўладаньня тэхнікай у шырокім масавым маштабе, непага ўжо абмяжоўвацца рамкамі такіх форм, як тэхнічны гурток. Патрэбны новыя формы масавай прапаганды тэхнікі, якія-б забясьпечылі 100 проц. ахоп рабочых тэхнічнай адукацыяй. У прыватнасьці, прышла пара паставіць задачу аб усеагульным навучаньні рабочых у разьмеры ТЭХМІНІМУМУ.

БССР ПЕРШАЯ ўвяла ўсеагульнае абавязковае навучаньне па лініі школ сацвыху. У гэтым годзе ў радзе раёнаў у нас уводзіцца абавязковае навучаньне на базе сямігодкі. Мы маем усе магчымасьці, каб гэты бліскучы прыклад перанесьці і ў справу тэхнічнай прапаганды.

Усе сілы партыі, камсамолу, прафсаюзаў, усе формы культурна-масавай агітацыйнай работы, павінны быць мабілізаваны для асваеньня пралетарыятам новых тэхнічных удасканаленьняў, для заваяваньня вышынь тэхнікі.

У Сіроцінскім раёне адцягваюць церабленьне сьпелага ільну

ЖОРСТКА УДАРЫЦЬ ПА АПАРТУНІСТАХ, ЯКІЯ, ТРЫМАЮЧЫ СТАЎКУ ВЫКЛЮЧНА НА МАШЫНЫ, НЕ ЖАДАЮЦЬ МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЕ НАЯЎНЫЯ ЛЮДЗКІЯ СІЛЫ НА УДАРНАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ІЛЬНАЎБОРАЧНАЙ

Чаму Асьвейшчына яшчэ не распачала ільнаўборкі

АСЬВЕЯ. У Асьвейскім раёне засеяна 3.316 гэкт. ільну. Ня гледячы на тое, што ЛЁН УЖО ПАСЬПЕЎ, да гэтага часу НІ АДЗІН З КАЛГАСАЎ ДА ЎБОРКІ НЕ ПРЫСТУПІЎ. СУШЫЛЬНЯ-МЯЛЬНЫЯ ПУНКТЫ, А ТАКСАМА І СЬЦЕЛІШЧЫ Ў КАЛГАСАХ НЕ ПАДРЫХТАВАНЫ. Ніякай падрыхтоўчай работы да ўборкі не вядзецца.

РАЙЗА, РАЙКАЛГАССАЮЗ І МТС плянаў уборкі і расстаноўкі рабочай сілы ня склалі. МТС і сама не падрыхтавалася да ўборкі.

Ніякага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку райза і райкалгассаюзу няма. Напежных мер, каб арганізаваць усе сілы раёну на пасьпяховую ўборку ільну, на прынята. НЕКАТОРЫЯ РАБОТНІКІ РАЁНУ, ЯК НАПРЫКЛАД, СТАРШЫНЯ РАЙЗА тав. КЛОПАЎ, РОБЯЦЬ ШКОДНУЮ СТАЎКУ ВЫКЛЮЧНА НА МАШЫНЫ, ІГНАРУЮЦЬ МАБІЛІЗАЦЫЮ ЎСІХ НАЯЎНЫХ ЛЮДЗКІХ СІЛ І ПРАВІЛЬНУЮ ІХ РАССТАНОЎКУ. Махровыя апартуністычныя адносіны Клопава і раду іншых работнікаў да пытаньняў ручной уборкі ільну—сурьёзная пагроза.

НЯ ЛЕПШ СТАІЦЬ СПРАВА З ПАБУДОВАЙ ІЛЬНАЗАВОДУ Ў ГЭТЫМ РАЁНЕ. Пабудова праходзіць марудными тэмпамі. Дырэкцыя сваячасова не забясьпечыла яе рабочай і цягавай сілай.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што АСЬВЕЙСКІ РАЁН НЕ ПАСТАВІЎ ПЕРАД САБОЙ УБОРКУ І АПРАЦОЎКУ ІЛЬНУ, ЯК ЦЭНТРАЛЬНУЮ ЗАДАЧУ. МЯСЦОВЫЯ АПАРТУНІСТЫ, якія спадзяюцца на самацёк і... выключна на машыны НЕ АТРЫМЛІВАЮЦЬ НАЛЕЖНАГА АДПОРУ.

ГЭТА ПАГРОЗА ІЛЬНУ ПАВІННА БЫЦЬ НЕАДКЛАДНА АДВЕДЗЕНА.

РАЁННАЕ ПАРТЫЙНА - САВЕЦКАЕ КІРАЎНІЦТВА ПАВІННА ПАВЯРНУЦЦА ТВАРАМ ДА ІЛЬНУ, мабілізаваць масы на ўдарную ўборку ільну, на барацьбу з кулаком. Апартуністы, якія ня хочуць выканаць дырэктыў партыі, павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Брыгада «Зьвязды» — В. Хмялеўская, Андэрсон, Кімстыч, Мацкевіч М.

„Сьпелы лён можа пачакаць"

СІРОЦІНА. (Па тэлеграфу).

У сіроцінскім раёне плян уборкі ільну складзен і зацьверджан пленумам РВК толькі 7 жніўня. Плянам прадугледжаны два тэрміны ўборкі ільну: першы — з 10 па 20 жніўня і другі — з 20 да 30 жніўня. Лічбы парыяду расьпісаны роўнымі часткамі на кожную дэкаду.

Усяго ў раёне ільну 7.315 гэкт.

Да ўборкі ільну прыступлена самацёкам. Апэрацыйнае кіраўніцтва з боку райза і калгассаюзу адсутнічае.

Масы не мабілізуюцца на датэрміновае скончэньне ільнаўборкі. У некаторых мясцох распаўсюджваюцца шкодныя думкі, быццам уборка тэхкультур — не першачарговая задача. У радзе сельсаветаў убіраюць збожжавыя, не зварачаючы ўвагі на лён. «Сьпелы лён,— заяўляюць праўленьні асобных калгасаў — можа пачакаць тыдзень, бо ўсё роўна раньні засеў згарэў». Гэтая кулацкая ўстаноўка ня сустрэла належнага адпору. Барацьбы з «чарговасьцю» не вядзецца.

Мінуцкі.

Пераключыліся на ўборку ільну

СЛУЦАК. (Наш кар.). Калгас «КАМБАЙН» адзін з першых у раёне скончыў уборку ячменю і закончвае ўборку жыта. Уся праца праводзілася на аснове зьдзельшчыны. Нормы выпрацоўкі перавыконваліся на 50 проц., а ў некаторых выпадках і на 90 проц.

У сучасны момант калгас пераключыўся на ўборку ільну і іншых тэхнічных культур. Для ўборкі ільну выкладзены брыгады, церабільшчыкаў, якія ўжо прыступілі да працы.

Я. Жылка.

Крупская спажкаапэрацыя ў баку ад уборачнай

КРУПКІ. Па раёне трэба ўбраць 2.017 гэкт. тэхкультур. Зусім зразумела, што ўборачная кампанія патрабуе ад райспажсаюзу і сельскіх спажтаварыстваў правядзеньня адпаведнай работы па забесьпячэньні ўборачнай кампаніі прамтаварамі і арганізацыі грамадзкага харчаваньня на полі.

Аднак спажкаапэрацыя ў гэтай галіне пакуль нічога ня робіць. Ня вызначаны фонды для прэміяваньня лепшых ударнікаў-калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і г. д. Нічога ня робіцца для арганізацыі сталовак.

Райспажсаюз павінен безадкладна выправіць гэтыя буйнейшыя недахопы ў забесьпячэньні ўборачнай кампаніі і арганізацыі грамадзкага харчаваньня на полі.

АЛІМОР.

ЧАВУСЫ І ЛЮБАНЬ

ІГНАРУЮЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА АПРАЦОЎКІ ТЭХКУЛЬТУР

Выраб ільнамалатарань „Эддзі" ўсё яшчэ не забясьпечан

Апартуністычная бязьдзейнасьць пагражае зрывам апрацоўкі тэхкультур

Агульны плян уборкі і асеньняй пасеўнай кампаніі па ЛЮБАНЬСКІМ раёне складзен і даведзен да сельсаветаў, але канкрэтнага, практычнага пляну ўборкі і першаапрацоўкі ільну і канапель няма ні ў райза, ні ў райкалгассаюзе, ні ў райкаапсаюзе.

Між тым, у раёне ўжо пачалося церабленьне ільну. На 5-га жніўня калгасамі выцераблена 87 гэкт. ільну і аднасобным сэктарам—96 гэкт.

Справе ўборкі і асабліва першаапрацоўкі ільну і канапель у раёне зусім мала аддаецца ўвагі.

Машын па абмалоце і ачосваньні галован у раёне няма. Зараз толькі райза адумаўся заказаць аднаму калгасу зрабіць 5 малатарань «Эддзі».

На заяве райза, райкалгассаюзу і райкаапсаюзу сьцеліпчамі раён забясьпечан, але ўліку іх няма.

Аб станоўчых мачыльных ям у раёне ні райкалгассаюзу, ні райкаапсаюзу нічога невядома.

Сушылкамі для надсушкі трасты калгасы не забясьпечаны.

Ёсьць у калгасах толькі 7 ільнямялак і 6 ільнатрапалак. 5 ільнатрапалак, якія павінны быць заведзены па пляне, яшчэ не атрыманы. З 15 падлягаючых завозу ў раён ільнамялак да гэтага часу прыбылі толькі 3 штукі.

На запытаньне Белільнасаюзу аб фактычна праведзеных мерапрыемствах па падрыхтоўцы да ўборкі ільну і канапель у Чавускім раёне, Чавускі райкаапсаюз адказаў, што «падрыхтоўка да ўборкі ільну і канапель яшчэ не праводзілася». Гэта ў той час, як ужо пачалася ўборка ільну.

Па такой махровай апартуністычнай бязьдзейнасьці любаньскіх і чавускіх раённых зямельна - калгасна - каапэрацыйных арганізацый трэба ўдарыць з усёй рашучасьцю.

А. П.

Завод „Камунар" абавязан сваячасова выканаць заказ

Паводле пастановы СНК БССР, Белсампрамсаюз павінен выпрацаваць 800 штук малатарань «Эддзі» для мапацьбы ільну.

Для таго, каб выпрацаваць гэтыя малатарні ў майстэрнях, Белсампрамсаюзу патрэбна атрымаць ад мэталязаводаў 1.600 валікаў і 3.200 падшыпнікаў. Заказ на выраб гэтых частак дан заводу «Камунар» (Менск). Завод узяў на сябе абавязак выпрацаваць 1.064 часткі да 15 жніўня.

У зьвязку з тым, што Белсампрамсаюз даставіў жалезо заводу «Камунар» толькі ў апошніх лічбах ліпеня, Белмэталяаб'яднаньне дала нарад на выраб 500 частак заводу імя Варашылава.

Такім чынам, заводу «Камунар» засталося вырабіць 564 камплектаў частак для «Эддзі». Што-ж мы маем? На сёньняшні дзень выраблена толькі 150 штук, з іх адгружана 50. На «Камунары» выраб частак для «Эддзі» ідзе самацёкам. Ня толькі дырэкцыя, але нават майстар татарнага цэху, ня ведае колькі валікаў выраблецца кожны дзень і колькі ўжо выраблена.

У адзін дзень выраблецца 40-45 частак. Пры сучасных тэмпах выканаць заказ да 15 жніўня немагчыма, бо для выразу 400 шт. трэба 10 дзён, г. зн. да 20 жніўня.

Нельга абыйсьці моўчкі і адносін Белсампрамсаюзу, які ня цікавіцца ходам выкананьня заказу. Старшыня Белсампрамсаюзу нават ня ведае, аб тым, што частка заказу з заводу «Камунар» перадана на завод імя Варашылава.

Б. Хар

УШЧЫЛЬНЕНЬНЕ ТЭРМІНАЎ УБОРАЧНАЙ—

адзін з лепшых мэтадаў барацьбы за новы масавы прыліў у калгасы

Ударныя тэмпы ўборкі выклікалі новы прыліў

РАГАЧОЎ. Калгасы «Равенства», «Аганёк», «Свабода», Рагачоўскага раёну ўборку сена і азімых скончылі.

Калгас «Равенства» ўбраў 150 гэктараў сенажаці, убрана і абмалочана: 60 гэктараў жыта, 4 гэкт. пшаніцы і 11 гэктараў ячменю.

Калгас «Аганёк» убраў 65½ гэкт. збожжавых культур і 89 гэкт. сенажаці.

У калгасе «Свабода» усяго ўбрана 302 гэкт. сенажаці і 113 гэкт. збожжавых культур.

У выніку пасьпяховай уборкі наглядаецца вялікі прыліў у перадавыя калгасы. У калгас «Аганёк» уступіла 4 гаспадаркі, імя Сьвярдлова—50 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у калгас «Равенства»— 8 гаспадарак. арганізаваны новыя калгасы ў вёсцы Сініеснаўка з 12 гаспадарак і вёсцы Міньковічы з 24 гаспадарак.

Ян. Кл.

50 гэкт. збожжавых яшчэ на корні

БЫХАЎ. У калгасе «Праца», Быхаўскага раёну, ня скошана шмат сенажаці і стаіць на корні больш 50 гэкт. азімага і яравога жыта. Гэты прарыў зьяўляецца вынікам адсутнасьці зьдзельшчыны і нерацыянальнага выкарыстаньня рабочай сілы.

Райкалгассаюз павінен неадкладна прыняць меры, каб ліквідаваць гэтыя прарывы.

Я. Кр.

Апартуністы ігнаруюць зьдзельшчыну і тармозяць уборку

УВАРАВІЧЫ. На аснове зьдзельшчыны і разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва калгасы «Будзённы», «Чырвоны шлях», «Энгельс», Уваравіцкага раёну, уборку сена і азімых скончылі.

У разгары ўборка яравых. Калгас «Будзённы» ўжо ўбраў 17 гэкт. ільну.

Аднак значная частка калгасаў яшчэ адстае. Прычына-ігнараваньне зьдзельшчыны і ўліку з боку праўленьняў калгасаў.

У выніку гэтага ў калгасе «Чынгарская дывізія», напрыклад ня ўбрана 230 гэкт. сенажаці і 30 гэкт. канюшыны. Трэба ўжыць рашучыя меры супроць апартуністаў, якія ігнараваньнем зьдзельшчыны зрываюць уборачную.

А. Казіміраў.

Да адказнасьці за прастой машын

Праўленьні калгасаў „Варашылава" і „Чырвоны барацьбіт" зрываюць уборку азімых

РАТАМКА. Плошча, засеяная жытам на сельсавеце складае 727 гэкт., па 3 жніўня зжата ўсяго 270 гэкт. або 37 проц. пляну. Невыкананьне пляну ўборкі азімых тлумачыцца тым, што праўленьні калгасаў «Чырвоны барацьбіт» і «Варашылава» злачынна зрываюць плян уборкі. На 2 жніўня з 25 жнівярак працавала ўсяго 13. У калгасе «Варашылава» 10 жнівярак адпачывалі, таму што праўленьне калгасу спраўляла сьвята.

Калгас «Барацьбіт» умовіўся даць на нядзелю свае жнівяркі калгасу «Чырвоны араты», але праўленьне «Аратага» ня выслала коняй за машынамі. Машыны стаялі цэлы дзень без працы.

У выніку злачыннай бязьдзейнасьці праўленьняў калгасаў жніво можа зацягнуцца яшчэ на тыдзень, апроч вызначаных па пляне 10 дзён.

За зрыў уборачнай, за прастой машын 2 жніўня павінны адказваць праўленьні калгасаў «Чырвоны араты» і «Варашылава».

С.

Фэрма—закінуты вучастак

У калгасе «ПРАЦА», Быхаўскага раёну, ёсьць усе ўмовы для развіцьця сьвінагадоўлі. На фэрме калгасу ёсьць 100 сьвінаматак, але належных сьвінарнікаў у калгасе няма. Яшчэ ў 1930 г. пачалі будаваць сьвінарнік. Застасецца яго толькі накрыць, але праўленьне калгасу зусім ня цікавіцца будаўніцтвам і сьвінагадоўляй наогул. Фэрма зьяўляецца закінутым вучасткам усёй гаспадаркі.

Я. Савіцкі

Змагары за сілас

Камуна імя БВА на Мар'інскім масыве 20 ліпеня скончыла будаўніцтва сіласнай вежы і траншэі ёмкасьцю ў 580 тон. Плян сіласнага будаўніцтва перавыкананы на 50 проц.

Зараз камуна прыступае да сіласаваньня; зялёнай масай камуна забясьпечана, засеяўшы 10 гэкт. кукурузы і 15 гэкт. сланечніку, будучы скарыстаны таксама і адкіды гарадніцтва.

АНІСІМАЎ.

РЭАЛІЗУЕМ АДОЗВУ ЦК і СНК

СУСТРЭЧНЫМ ПЛЯНАМ КАЛГАСНАЙ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ

АДКАЗВАЕ РАГАЧОЎШЧЫНА НА АДОЗВУ ПАРТЫІ І УРАДУ

1487 таварных сьвіней абавязаўся здаць дзяржаве саўгас „Велень"

Саўгасы „Блонь", „Шыкатавічы" і „Жагарэлае"—пралетарская грамадзкасьць чакае вашага адказу

За 1.487 таварных сьвіней

Саўгас „Велень" адказвае на адозву ЦК і СНК

РАБОЧЫ КАЛЕКТЫЎ І АДМІНІСТРАЦЫЯНА - ТЭХНІЧНЫ ПЭРСАНАЛ САЎГАСУ «ВЕЛЕНЬ-СІНЬЧА», ПУХАВІЦКАГА РАЁНУ, АБМЕРКАВАЎШЫ АДОЗВУ ЦК І СНК СССР, ПРЫНЯЎ НА СЯБЕ РАД КАНКРЭТНЫХ АБАВЯЗАЦЬЕЛЬСТВАЎ НА РАЗГОРТВАНЬНІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ. САЎГАС, ЯКІ АРГАНІЗАВАНЫ ЯШЧЭ Ў МІНУЛЫМ ГОДЗЕ НА ПЛОЩЧЫ Ў 2.700 ГЭКТ., УСЁ БОЛЬШ І БОЛЬШ ПАШЫРАЕЦЦА.

ПАГАЛОЎЕ САЎГАСУ — 2.948 СЬВІНЕЙ У ТЫМ ЛІКУ 834 СЬВІНАМАТАКІ. САЎГАС УЖО СКОНЧЫЎ СЕНАЎБОРКУ НА ПЛОЩЧЫ Ў 880 ГЭКТ. СЕНАЖАЦЯЙ, 200 ГЭКТ. ШМАТГАДОВЫХ ТРАЎ, ШТО ДАЕ МАГЧЫМАСЬЦЬ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ СТАДА ГРУБЫМІ КАРМАМІ. У САЎГАСЕ СКОНЧАНА ПАБУДОВА ТРАНШЭЯ І СІЛАСНЫХ ВЕЖ ДЛЯ СІЛАСАВАНЬНЯ 836 ТОН ЗЯЛЁНАЙ МАСЫ.

ПОВАЧ З ГЭТЫМ У САЎГАСЕ МЫ МАЕМ РАД ХІБАЎ. ТАК, ПЛЯН БУДАЎНІЦТВА СЬВІНАРНІКАЎ ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 50 ПРОЦ., А КАМПЛЕКТАВАНЬНЯ НА 49 ПРОЦ.

ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА І АРГАНІЗАЦЫЯ ЎЛІКУ ПРАЦЫ ЯШЧЭ НЕ ЗАМАЦАВАНЫ.

РАБОЧЫ КАЛЕКТЫЎ І АДМІНІСТРАЦЫЯНА - ТЭХНІЧНЫ ПЭРСАНАЛ САЎГАСУ АБВЯЗАЎСЬЦІЛІ СЯБЕ МАБІЛІЗАВАНЫМІ НА ЛІКВІДАЦЫЮ ГЭТЫХ ПРАРЫВАЎ І АБАВЯЗАЛІСЯ:

СКОНЧЫЦЬ ПАБУДОВУ СЬВІНАРНІКА ДА 1 ЛІСТАПАДА, ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ БУДАЎНІЦТВА ЛЕСАМАТАР'ЯЛАМІ, ПОЎНАСЬЦЮ І Ў ТЭРМІН ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ЗДАЧЫ ТАВАРНАЙ ПРАДУКЦЫІ Ў КОЛЬКАСЬЦІ 1.487 ГАЛОЎ І ПЛЯН КАМПЛЕКТАВАНЬНЯ Ў РАЗЬМЕРЫ 1.700 СЬВІНАМАТАК.

СІЛАСАВАНЬНЕ ПРАВЕСЬЦІ Ў РАЗЬМЕРЫ 836 ТОН.

У САМЫ БЛІЖЭЙШЫ ТЭРМІН ЛІКВІДАВАЦЬ АБВЯЗЬЛІЧКУ І ПРАВЕСЬЦІ Ў ЖЫЦЬЦЁ ЗОЛАВЭТМІНІМУМ.

САЎГАС «ВЕЛЕНЬ-СІНЬЧА» ВЫКЛІКАЕ НА САЦСПАБОРНІЦТВА САЎГАС «БЛОНЬ».

ПА ДАРУЧЭНЬНІ СХОДУ:
ДЫРЭКТАР САЎГАСУ ПАПІХАЙЛІК.
САКРАТАР ПАРТ'ЯЧЭЙКІ ГОЦУК.
САКРАТАР РАБАЧКОМУ ЧАРНОЎСКІ.

Адозва партыі і ўраду ў дзеяньні

РАГАЧОЎ. Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі знайшла шырокі водгук сярод раённых арганізацый. 4 жніўня пры райкоме КП(б)Б адбылася інструкцыйная нарада кіраўнікоў устаноў, на якой абгавораны канкрэтныя мерапрыемствы для практычнага ажыцьцяўленьня адозвы партыі і ўраду.

Лік малочна - таварных фэрм у раёне вызначана павялічыць з 14 на 1 жніўня да 30, а колькасьць галоў у іх павялічыць з 1.000 па 1 жніўня да 2.500.

Колькасьць сьвінагадоўчых таварных фэрм вызначана павялічыць з 28 на 1 жніўня да 40 з стадам да 3.570 галоў.

Такія-ж мерапрыемствы вызначаны па птушцы і трусагадоўлі.

Для правядзеньня гэтых мерапрыемстваў у сельсаветы накіравана 50 чалавек з раённага актыву і 30 камсамольцаў.

САЛАДУХІН.

Да адказнасьці зрыўшчыкаў будаўніцтва

У племгасе імя КАМІНТЭРНУ, Менскага раёну, будуецца абора на 200 шт. На пабудову аборы ўжо затрачаны тысячы рублёў. Але якасьць будаўніцтва нікуды ня вартая. На запытаньне чаму так дрэнна будуюць, тэхнік Белсельбуду СЯРГІЕНКА адказвае:

«Будуем на два-тры гады, а там будзе цагляная».

Паступ плян будаўніцтва ў саўгасе выкананы усяго на 30 проц.

Па віне Сяргіенкі з пабудовы разьбеглася ўсе цесьляры. Зараз выкананьне пляну будаўніцтва пад пагрозай.

Вінаватых у зрыве будаўніцтва трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Бэ.

Каму здаваць адкормленых сьвіней?

ПЛЕШЧАНІЦЫ. 1.800 сьвінаматак — вось праграма сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрм раёну. На сёньняшні дзень яна выканана ўсяго ў разьмеры 52 процантаў.

Гадавы плян здачы таварнай прадукцыі — 4.100 таварных сьвіней. На 1 жніўня здана ўсяго... 16 сьвіней.

У некаторых калгасах ёсьць ужо адкормленыя сьвіньні, гатовыя для здачы, але няма каму іх аддаваць. Райкаапсаюз ня прымае, а Белмяса не арганізавала прыёмных пунктаў.

У калгасных фэрмах ёсьць годныя для адкорму 400 сьвіней, але для гэтага не хапае кармоў і сьвіньні знаходзяцца толькі на падножным корме. Беларускае аддзяленьне Сьвінаводкалгасцэнтру яшчэ 12 чэрвеня паведаміла аб высыльцы 100 цэнтнэраў высевак, але і дагэтуль яны не атрыманы.

Брыгада «Зьвязды».
САКАЛОЎСКІ, ЛУКАШЭВІЧ.

Змагары за сілас

Камуна імя БВА на Мар'інскім масыве 20 ліпеня скончыла будаўніцтва сіласнай вежы і траншэі ёмкасьцю ў 580 тон. Плян сіласнага будаўніцтва перавыкананы на 50 проц.

Зараз камуна прыступае да сіласаваньня; зялёнай масай камуна забясьпечана, засеяўшы 10 гэкт. кукурузы і 15 гэкт. сланечніку, будучы скарыстаны таксама і адкіды гарадніцтва.

АНІСІМАЎ.

Кармавую базу—сацыялістычнай жывёлагадоўлі

ПАДЗЕНШЧЫНА І УРАУНІЛАУКА—

прычыны прарываў на сенажацях Мазыршчыны і Асьвеі

Кожны дзень затрыманьня сенаўборкі і сіласаваньня пагражае стратамі кармавой базы

Далейшае адставаньне нецярпіма

Саўгасы Мазыршчыны гаможна адстаюць з уборкай сенажацый, ня гледячы на тое, што апошні тэрмін уборкі ўжо прайшоў.

Саўгас «Ліпава» да апошняга часу навет ня ведаў, колькі ў яго сенажацый, 1.500—1.800 га—вось лічбы, якімі апэраваў саўгас. Выходзячы з гэтых лічбаў саўгас патрабаваў сродкі на ўборку, прамтавары і г. д.

У сапраўднасьці-ж у саўгасе ёсьць усяго 543 га сенажацый. З гэтай плошчы на 5 жніўня было ўбрана 353 га.

Саўгас «ДАБРЫНЬ» сапраўды паўдарнаму поўнасьцю ўбраў 123 га сенажацій выключна сваімі сіламі. У апошнія дні калгас «Чырвоная Зорка» адпусьціў саўгасу яшчэ 65 га сенажаці, якія таксама ўбіраюцца ўдарнымі тэмпамі.

Раённыя арганізацыі вельмі мала дапамагаюць гэтаму саўгасу. Саўгасу не хапае 3.000 цэнтнэраў грубых кармоў, ня гледзячы на гэта яму ня прырэзваюць дадатковай сенажаці ў колькасьці патрэбнай для стварэньня кармавой базы.

Саўгас «ДАРАШЭВІЧЫ», ня гледзячы на спрыяючыя ўмовы, надта зацягнуў уборку з прычыны няправільнай расстаноўкі і скарыстаньня рабочай сілы.

Больш усяго адстае саўгас «Зара Захаду», які з 450 га ўбраў толькі 144—34 проц. Турайскія раённыя арганізацыі абяцаюць арганізаваць дапамогу гэтаму саўгасу з боку калгасу. Трэба, каб гэта абяцаньне было безадкладна рэалізавана, бо інакш малады, яшчэ не ўмацаваны, саўгас «Зара Захаду» з уборкай ня справіцца.

Важнейшая работа па прыцягненьні на сенаўборку калгасьнікаў на падставе дагавораў аб узаемадапамозе саўгасамі зусім не праводзіцца.

Дырэктары і рабачкомы саўгасаў павінны памятаць, што ад працоўнай узаемадапамогі саўгасаў і калгасаў залежыць пасьпяховы ход уборкі. Раённыя арганізацыі павінны дапамагчы практычна ажыцьцявіць гэта мерапрыемства.

Ажыцьцяўленьне зьдзельшчыны — лепшы сродак для ўзмацненьня тэмпаў па сенажацях, між тым, такія саўгасы, як «Нічава», «Зара Захаду», «Дарашэвічы» і «Дуброва» дагэтуль яшчэ не ажыцьцявілі зьдзельшчыны.

Саўгасы Мазыршчыны павінны безадкладна ліквідаваць адставаньне на сенажацях і ў бліжэйшыя дні скончыць сенаўборку.

Б. Г.

Сенажаці ня скошаны

У калгасах Асьвейшчыны ігнаруюць зьдзельшчыну і ўлік

У многіх калгасах Асьвейскага раёну ня ўведзены сацыялістычныя мэтады работы. Зьдзельшчына існуе фармальна, уліку працы не вядзецца, прадукцыі ў працоўныя кніжкі не запісваюцца. Аб мэтадах сацспаборніцтва і ўдарніцтва многія калгасы навет і ня ведаюць.

У выніку, у некаторых калгасах як «АВАНГАРД», «ЯУЦІС-ЦЕЛЕШ» і інш. больш паловы сенажацій ня скошана, а калгас «ШЛЯХ ЛЕНІНА» толькі прыступіў да касьбы.

Гэты прарыў райза тлумачыць недахватам рабочай сілы. У той-жа час, падкулачнікі, карыстаючыся гэтым прарывам, адкрыта заяўляюць: «Падзяждо сенажаць для індывідуальнага карыстаньня калгасьнікаў, сенажаць будзе скошана тэрмінова».

Гэты факт гаворыць аб тым, што рабочая сіла ў наяўнасьці, толькі асьвейскі райза і райкалгассаюз ігнаруюць пастановы партыі і

Шэсьць рашаючых задач, указаных у прамове тав. Сталіна,

выканаць на кожным прадпрыемстве

АД РЭАЛІЗАЦЫІ ГЭТЫХ ЗАДАЧ ЗАЛЕЖЫЦЬ ДАЛЕЙШАЕ РАЗВІЦЬЦЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

ПАРТКАЛЕКТЫВЫ „ЧЫРВОНАГА МЭТАЛІСТА“ І РАГАЧОЎСКАЙ КАРДОННАЙ ФАБРЫКІ ФАРМАЛЬНА АДНЕСЬЛІСЯ ДА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ВАЖНЕЙШАГА МЕРАПРЫЕМСТВА

Баявой работай рэалізаваць прамову т. Сталіна

Тав. СТАЛІН у сваёй прамове на нарадзе гаспадарнікаў высунуў 6 задач перад нашай прамысловасьцю, якія вынікаюць з новай абстаноўкі і новых умоў. Задачы гэтыя наступныя:

Прайшло больш месяца з часу апублікаваньня прамовы тав. Сталіна. Мы ўжо маем поўную падставу ставіць пытаньне аб тым, ЯК-ЖА НІЗАВЫЯ ВЫТВОРЧЫЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ Ў СВАЁЙ ПРАКТЫЧНАЙ РАБОЦЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЮЦЬ ГЭТЫЯ ЗАДАЧЫ.

Матар'ялы з месц гавораць аб тым, што абсалютная большасьць партарганізацый фабрык і заводаў БССР ПЕРАКЛЮЧЫЛАСЯ на выкананьне гэтых баявых заданьняў і дабіліся ўжо некаторых, праўда, далёка невыстарчальных, вынікаў. Абноўленае парткіраўніцтва БАБРУЙСКАГА КАМБІНАТУ на аснове змыцьцяўленьня прамовы тав. Сталіна забясьпечыла пералом у выкананьні прамфінпляну. Аднак, на гэтым супакойвацца ні ў якім разе нельга. Неабходна праз поўную рэалізацыю мерапрыемстваў, высунутых правадыром партыі, дабівацца ня толькі поўнага выкананьня вытворчай праграмы бягучых месяцаў, але і перакрыць запазычанасьць краіне, якая стварылася ў рэзультаце прарываў у першым паўгодзьдзі.

Аднак, у КП(б)Б ёсьць яшчэ і такія вытворчыя парт'ячэйкі, што ня ўжылі рашучых мер, каб тыя асноўныя ўказаньні, якія даў тав. Сталін, ператварыць у канкрэтную справу. На РАГАЧОЎСКАЙ КАРТОННАЙ ФАБРЫЦЫ партарганізацыя не забясьпечыла пералому ў сваёй рабоце. НА «ЧЫРВОНЫМ МЭТАЛІСЬЦЕ» (Віцебск) ні адно мерапрыемства, вызначанае пры распрацоўцы прамовы тав. Сталіна, не праведзена ў жыцьцё. Кіраўнікі партарганізацыі і гаспадарнікі абмежаваліся толькі ўрачыстымі дэклярацыямі і на ўжылі рашучых мер па ліквідацыі ўраўнілаўкі па забясьпячэньні прадпрыемства кадрамі рабочых. Гаспадарнікі не дадумаліся да таго, каб падручных фармоўшчыкаў перасунуць на больш кваліфікаваную работу, а на іх месца на аснове дагавораў завербаваць калгаснікаў. Такая работа нікуды ня варта. Рэзалюцыйнымі закліканьнямі і дэклярацыямі справу не дапаможаш. Патрэбна баявая большавіцкая работа па ажыцьцяўленьні важнейшых дырэктыў партыі.

Кожны вытворчы парткалектыў, кожная цэхавая парт'ячэйка, нарэшце, павінны сабе ўявіць, што 6 задач, высунутых тав. Сталіным на нарадзе гаспадарнікаў, вырашаюць становішча далейшага разьвіцьця нашай прамысловасьці. Таму ўсе сілы трэба кінуць на іх поўную рэалізацыю ва ўмовах кожнага прадпрыемства. ПРАМОВА ТАВ. СТАЛІНА ПАВІННА ЛЕГЧЫ Ў АСНОВУ ЎСЁЙ РАБОТЫ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ. Ня выпустошваючы высокага палітычнага зьместу гэтых задач, партарганізацыі павінны шчыльна падыйсьці да іх практычнага вырашэньня. Справа не ў рэзалюцыях, не ў абяцаньнях, а ў канкрэтнай баявой рабоце. КП(б)Б работу кожнай вытворчай партарганізацыі будзе ацэньваць па тым, наколькі гэтая арганізацыя ў сваёй практычнай рабоце забясьпечыла правядзеньне ў жыцьцё прамовы тав Сталіна.

Ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў высунутых тав. Сталіным забясьпечыла пералом

Асноўнымі прычынамі невыкананьня прамфінпляну, на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце зьяўляюцца: неперабудаванасьць работы партыйнай арганізацыі, нежаданьне вывучаць вытворчыя працэсы, займацца пытаньнямі рацыяналізацыі і далейшай мэханізацыі вытворчасьці і тое, што дзесяткі камуністаў не зьяўляюцца прыкладнымі ў ўцэхах, брыгадах, не зьяўляюцца ініцыятарамі і арганізатарамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Старое апартуністычнае партыйнае кіраўніцтва аказалася нездольным мабілізаваць шырокія масы рабочых на выкананьне прамфінпляну, змагацца з рвачамі, прагульшчыкамі, якія дэзарганізавалі вытворчасьць, павялічвалі брак, зьнішчалі якасьць прадукцыі, псавалі імпартнае абсталяваньне.

У фанэрным цэху, які па сутнасьці зьяўляецца самастойным заводам, камуністы ня былі расстаўлены ў цэхах і брыгадах так, каб яны ўплывалі на рабочых і непасрэдна адказвалі-б за работу ўсяго фанэрнага цэху.

Такое-ж становішча было і ў белдрэўным цэху, дзе замест 1.100 экспартных дзьвярэй, цэх на працягу першага паўгодзьдзя даваў толькі 300-400 кожны дзень. У сувязі з чым плян экспарту ў першым паўгодзьдзі ніколі больш ня выконваўся як на 40-41 проц.

Яшчэ горш становішча было ў стандартным цэху. Стандартны цэх адказвае перад краінай за своячасовае забясьпячэньне тарнякоў Данбасу жыльём. Цэх кожны дзень павінен даваць 2,6 стандартнага дому, а цэх на працягу некалькіх месяцаў даваў толькі 0,8 дому. Больш як 200 дамоў на працягу першага паўгодзьдзя цэх не даваў гарнякам Данбасу.

Адсутнасьць гаспадарчага разрахунку ў цэхах і брыгадах, маўчаньне абязьлічкі і ўраўнілаўкі спрыялі росту прарыву ў выкананьні прамфінпляну камбінатам і асабліва фанэрным, белдрэўным і стандартным цэхамі. Толькі пасьля прыезду брыгады «Зьвязды», на камбінаце было пастаўлена пытаньне аб пераводзе цэхаў на гаспадарчы разрахунак. Партарганізацыя і мясцкомы прафсаюзаў раней гэтым пытаньнем зусім не займаліся.

Бабруйскі раённы камітэт партыі не аказваў належнай дапамогі камбінату ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну. Нават пасьля таго, як было распушчана бюро парткалектыву камбінату за апартуністычную практыку, за нездольнасьць мабілізаваць масы на барацьбу за прамфінплян, райком партыі не аказаў патрэбнай дапамогі новаму часовому кіраўніцтву. Член бюро райкому тав. Гароўкэр, які быў прымацован як старшыня райпрафсавету да камбінату для аказаньня партыйнай і прафэсыянальнай арганізацыям дапамогі, толькі адзін раз паказаўся на камбінаце, склаў плян перабудовы партыйнай і прафэсыянальнай работы і больш ня прыходзіў.

У свой час сакратар партыйнага калектыву камбінату на нарадзе пры ЦК КП(б)Б па пытаньні перабудовы партыйнай і прафэсыянальнай работы на прадпрыемствах дакладваў, што на камбінаце распрацаваны пляны перабудовы, вызначаны схэмы расстаноўкі партыйных сіл і пасьпяхова праводзяцца ў жыцьцё. Схэмы і пляны засталіся ляжаць у сталах партыйнага калектыву і ня былі даведзены ні да цэху, ні да брыгады, ні да шырокай масы камуністаў.

Нядаўна на камбінаце праведзены перавыбары партыйных органаў, выбран новы склад бюро парткалектыву. Зараз парткалектыў разгорнута вялікая работа па ажыцьцяўленьні мерапрыемстваў, якія высунуў тав. Сталін у сваёй прамове на нарадзе гаспадарнікаў. У цэхах ліквідуецца абязьлічка і ўраўнілаўка, арганізаваны дзесяткі новых ударных брыгад, заключаны дагавары па сацыялістычным спаборніцтве.

Партыйны калектыў з усёй рашучасьцю ўзяўся за перабудову партыйнай работы вынізу да верху, за выкананьне дырэктыў партыі аб перанясэньні цяжару партыйнай і прафэсыянальнай работы ў цэх, брыгаду і вымену. У цэхах арганізаваны зьменныя вячэйкі, групы, вызначаны парторгі і групоргі.

Зараз ужо ёсьць першыя далатныя вынікі перабудовы партыйнай работы і ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў, вызначаных тав. Сталіным. У ліпені фанэрны цэх выканаў плян па экспарце на 101 проц., лесацэх — 150 проц. экспартнага пляну. Стандартны цэх замест 37 проц. у чэрвені, даў 70 проц. прамфінпляну ў ліпені.

Гэтыя першыя, яшчэ далёка невыстарчальныя, посьпехі ні ў якім разе не павінны супакоіць партыйную арганізацыю. Партарганізацыя камбінату павінна яшчэ з большай энэргіяй і мабілізацыяй сіл змагацца за поўнае выкананьне пляну.

Н. Нэйдлін.

Няўменьне працаваць па-новаму прывяло да прарыву

Партыйная ячэйка Рагачоўскай картоннай фабрыкі імя Сталіна дабілася значных посьпехаў у выкананьні прамфінпляну, у мабілізацыі рабочых на павышэньне прадукцыйнасьці працы, на зьніжэньне сабекошту і на паляпшэньне якасьці прадукцыі. Прамфінплян ударнага кварталу рабочым калектывам фабрыкі быў выкананы на 103,2 проц., першага кварталу гэтага году—на 116,7 проц. і прамфінплян другога кварталу выкананы на 95 проц.

Посьпехі ва ўдарным квартале і ў першым квартале гэтага году былі абумоўлены разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва, тым, што 98 проц. усіх рабочых знаходзяцца ва ўдарных брыгадах, да мінімуму зьведзены прагулы. Дзесяткамі і сотнямі рабочых прапаноў, праз рацыяналізацыю паасобных вытворчых працэсаў дасягнута значная эканомія сродкаў.

У гэтыя-ж два кварталы ячэйка праробіла вялізарную работу па вярбоўцы ў партыю лепшых рабочых ударнікаў, якія на справе паказалі бальшавіцкія ўзоры работы. Ячэйка дабілася таго, што 40 проц. рабочых ад варштату ўступілі ў партыю.

Але мы павінны адзначыць, што ячэйка, дасягнуўшы значных посьпехаў у справе барацьбы за выкананьне прамфінпляну, арганізацыі шырокай масавай работы сярод рабочых, ня здолела замацаваць посьпехаў. Пасьля першых перамог, якія атрымала ячэйка і ўвесь калектыў рабочых, сярод партыйнага кіраўніцтва і ўсяго партыйнага калектыву наступіла нейкае заспакаеньне, аслабленьне ўвагі да пытаньняў вытворчасьці, да рацыяналізацыі, барацьбы з прагуламі. Ячэйка аслабіла кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарнымі брыгадамі, закінула праверку работы камуністаў у сувязі з чым аслабла спаборніцтва і прадукцыйнасьць працы ўдарных брыгад зьнізілася.

Гэтым і тлумачыцца, што ў другім квартале гэтага году фабрыка працавала значна горш чым у першым. Ня было ніякіх аб'ектыўных прычын, каб прамфінплян застаўся невыкананым. Былі ўсе магчымасьці ў другім квартале даць ня горшыя паказальнікі чым у першым.

Дырэктывы партыі аб перабудове партыйнай работы на вытворчасьці ў адпаведнасьці з новымі задачамі партыйнай ячэйкай ня былі праведзены ў жыцьцё. Партыйная ячэйка працавала ў другім квартале старымі формамі і мэтадамі. Прамова тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, у якой вызначана баявая праграма работы вытворчых партарганізацый ня ўнесла пералому ва ўсю работу ячэйкі.

Мерапрыемствы, высунутыя тав. Сталіным, ячэйка не папулярызавала, не давяла да кожнага рабочага, не прыняла ніякіх канкрэтных захадаў, каб на аснове паказаньняў праводыра партыі, мабілізаваць рабочых на зьнішчэньне недахопаў на фабрыцы, на ліквідацыю прарыву, які здарыўся ў другім квартале. Треба падкрэсьліць, што ў другім квартале значна павысіўся процант прагулаў, якасьць прадукцыі пайшла ўніз, узрос брак і зьнізілася прадукцыйнасьць працы.

Партарганізацыя фабрыкі павінна неадкладна пераключыцца на баявыя тэмпы работы, павінна пакласьці ў аснову ўсёй сваёй дзейнасьці кіруючыя паказаньні тав. Сталіна, улічыць новыя асаблівасьці і новыя ўмовы работы. Толькі перабудова ўсёй работы на фабрыцы, жорсткая барацьба з усякімі адхіленьнямі ад лініі партыі і разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва змогуць забясьпечыць перамогу фабрыкі ў тэмпе рашаючым годзе пяцігодкі.

г. Рагачоў.

І. САЛАДУХІН.

Далей дэклярацый не пашлі

(Парткалектыў „Чырвонага мэталіста“ Віцебск)

Прамова тав. Сталіна была шырока прапрацавана на заводзе «Чырвоны мэталіст». Яна абгаварвалася ў партыйных ячэйках, на камсамольскіх сходах і сярод рабочых. Для рэалізацыі задач, якія паставіў тав. Сталін перад прамысловасьцю, гаспадарнікамі і партыйнымі арганізацыямі на заводзе быў прынят рад пастаноў.

З часу абгаварэньня прамовы т. Сталіна прайшло больш месяца. Мы вымушаны адзначыць, што ні адно вызначанае пастановай мерапрыемства на заводзе не рэалізавана. Завод зараз у асноўным выробляе бульбакапалкі і жмыхацеральнікі. Выпуск гэтых машын патрабуе асаблівай увагі з боку адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Між тым, патрэбнага нагляду за выпускам машын няма. Паасобныя дэталі вырабляюцца і да сёнешняга дня саматужным парадкам. Прапановы рабочых аб мэханізацыі вырабу дэталяй кіраўніцтвам заводу замарынаваны, у той час, як іх ажыцьцяўленьне дало-б вялізарны рост прадукцыйнасьці працы і зьніжэньне сабекошту прадукцыі.

УРАЧЫСТЫЯ АБЯЦАНЬНІ АДМІНІСТРАЦЫІ І ПАРТЫЙНАГА КАЛЕКТЫВУ ЛІКВІДАВАЦЬ УРАЎНІЛАЎКУ І АБЯЗЬЛІЧКУ, ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ ЗНАЙШЛІ СВАЁГО НЕПАСРЭДНАГА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ. ВА ЎСІХ БЯЗ ВЫКЛЮЧЭНЬНЯ ЦЭХАХ МОЖНА СУСТРЭЦЬ ТАКІЯ ФАКТЫ, КАЛІ ФАРМАЎШЧЫК ДРУГОГА РАЗРАДУ ЗАРАБЛЯЕ БОЛЬШ, ЧЫМ ФАРМАЎШЧЫК 5-6 РАЗРАДУ, КАЛІ КВАЛІФІКАВАНЫ ТЭХНІК АТРЫМЛІВАЕ МЕНШ ПАЎКВАЛІФІКАВАНАГА РАБОЧАГА.

Завод перажывае вялізарны недахват кваліфікаваных кадраў рабочых. Асабліва не хапае фармаўшчыкоў. На заводзе побач з кваліфікаванымі рабочымі-фармаўшчыкамі, ліцейшчыкамі і г. д., на працягу некалькіх год працуюць падручныя, якія дасканала ведаюць вытворчыя працэсы і якія пры атрыманьні мінімальных ведаў аб тэхніцы змаглі-б замяніць кваліфікаваных ліцейшчыкаў, фармаўшчыкоў, токараў і інш. Адміністрацыя, як і партыйны калектыў, да гэтага часу не праявілі ніякай ініцыятывы ў справе падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў рабочых.

КАСТУСЬ ВІЦЕБСКІ.

АБ ПААСОБНЫХ ФАКТАХ ПАРУШЭНЬНЯ ПАРТДЫСЦЫПЛІНЫ, ЗЬВЯЗАНЫХ З МЕРАПРЫЕМСТВАМІ ПАРТЫІ ПА УМАЦАВАНЬНІ РАЁНАЎ

ПАСТАНОВА ПК ЦКК КП(б)Б

1. Генэральная чыстка і праверка радоў партыі садзейнічала задаваленьню і ўмацаваньню радоў КП(б)В, узьняла на большую ступень адказнасьць усіх арганізацый КП(б)Б і кожнага камуніста ў паасобку за выкананьне задач партыі ў справе набудовы сацыялізму, узмацніла становішча партдысцыпліны.

2. Аднак як матар'ялы вынікаў чысткі партыі, так і практыка разгляду персанальных партыйных спраў у парткалегіі ЦКК пасьля чысткі сьведчаць, што факты парушэньня партыйнай дысцыпліны і на сёнешні дзень складаюць адзін з найбольшых відаў партпраступкаў. Прычым факты парушэньня партыйнай дысцыпліны адбываюцца ў значнай меры на лініі адмаўленьня ці нежаданьня ехаць на работу ў раён, сельсавет, саўгас, калгас, ці самавольна, без згоды парторганаў, а тае ці іншае прычыны пакідаюць работу.

3. Ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы і напружанай работы партыі на фронце сацыялістычнага наступленьня, калі неабходна «забясьпечыць і ў дальнейшым баявы бальшавіцкі тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва» і «хоўзаць ленінскае адзінства партыйных радоў, яшчэ больш узмацніць барацьбу з усімі відамі апартунізму і прымірэнцтва да яго і ў асаблівасьці супроць правага ўхілу, бязьлітасна прасякаючы ўсякія спробы, накіраваныя да расстаўленьня жалезнай партыйнай дысцыпліны» (XVI зьезд УсеКП(б). Парткалегія ЦКК лічыць недапушчальным такія факты парушэньня партыйнай дысцыпліны і вынарачае асаблівую ўвагу РК, РКК, партячэйкам на неабходнасьць прыняцьця адпаведных арганізацыйна-парткіраўніцкіх і асабліва выхаваўчых мер да ўзмацненьня партыйнай дысцыпліны ў партарганізацыі наогул і па, дакладнае і хуткае выкананьне даручэньняў і заданьняў парторганаў кожным камуністам у паасобку.

4. Кіруючыся ўказаньнем ЦКК УсеКП(б) аб тым, што парткалегіі кантрольных камісій УсеКП(б) павінны «забясьпечыць пасьпяховую барацьбу за яшчэ большую ідэйную згуртаванасьць партыі, за высокую якасьць і тэмпы работы ўсіх членаў партыі, выхаваньне вялічайшай дысцыпліны, гатоўнасьць па закліку партыі выканаць кожную ўскладзеную на члена партыі работу і дакладнае выкананьне пастаноў партыі і ўраду» і што «як у перыядзе грамадзянскай вайны адданасьць камуніста справе партыі вымяралася яго гатоўнасьцю па першым закліку выступіць на фронт са зброяй у руках, так зараз, у перыяд сацыялістычнага наступленьня, неабходна патрабаваць ад кожнага члена партыі вялікай дысцыплінаванасьці і гатоўнасьці па закліку партыі адправіцца ў любы раён на работу ў калгасе, саўгасе, на пасоўную, уборачную, сплаўную і т. п. кампаніі» (Яраслаўскі). Парткалегія ЦКК КП(б)Б катэгарычна папярэджвае ўсіх членаў партыі, што выпадкі адмаўленьня ад паездкі на ўзмацненьне работы ў раёне, сельсавеце, калгасе, саўгасе і г. д., ці самавольныя выезды адтуль, будуць разглядацца, як самае цяжкое партыйнае злачынства і пры выяўленьні злосных фактаў — вінаватыя будуць прыцягвацца да суровай партыйнай адказнасьці, аж да выключэньня з партыі.

5. Разам з гэтым парткалегія ЦКК папярэджвае райкомы і РКК аб недапушчальнасьці фармальна-бюракратычнага падыходу да справы пасылкі таварышоў працаваць у вёску, праводзячы пры кожнай масавай пасылцы на работу ў вёску адпаведную растлумачальную работу, самым уважлівым чынам падбіраць падыходзячых таварышоў, разглядаць матывы адмаўленьня таго ці іншага таварыша ад паездкі ў раён (вёску, саўгас, калгас і інш.) ці ад дачага заданьня і даручэньня, што ў паасобных выпадках можа заслугоўваць увагі.

6. Партыйныя арганізацыі на мясцох, павышаючы партыйную дысцыпліну камуністаў па дзеяводзе працы сваіх арганізацый і пры сьмелым разгортваньні бальшавіцкай самакрытыкі, — яшчэ ў большай меры згуртуюць і замацуюць сталёвае адзінства радоў партыі для больш пасьпяховага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

САКРАТАР ПК ЦКК КП(б)В

Рыскін.

НАСУСТРАЧ НАВУЧАЛЬНАМУ ГОДУ

Саюзтранс і Белкаапсаюз

зрываюць перасылку падручнікаў

Умелым выкарыстаньнем мясцовых рэсурсаў, мабілізацыяй увагі і сродкаў насельніцтва забясьпечым скончэньне будаўніцтва і школьнага рамонту

Агідная цяганіна

На 15 жніўня павінна было быць падрыхтавана падручнікаў для школ першага і другога канцэнтру, для ФЗС, ліквпунктаў, школ малапісьменных і вячэрніх школ рабочай і калгаснай моладзі—усяго 83 назвы.

На сёньня вышла з друку толькі 18 назваў, друкуецца 46, у БДВ знаходзіцца 11, а рэшта ў мэтадкоме і аўтараў.

Ужо прайшоў тэрмін рассылкі праграм, аднак, на сёньня яшчэ 6 праграм чакаюць ня выйсьці з друку. Зараз выяўлены тормазы перасылкі падручнікаў у раён. Імі зьяўляюцца Саюзтранс і база Белкаапсаюзу.

У гэтых установах у наяўнасьці факты, якія мяжуюцца з простым злачынствам. Факты: 23-га ліпеня Саюзтранспарт атрымаў даручэньне на адпраўку ў Рэчыцу падручнікаў для другога і трэцяга гадоў навучаньня, і ў Чашніку і Сурам падручнікаў для першапачатковых школ.

Гэтыя падручнікі і зараз ляжаць на базе Белкаапсаюзу.

Не адпраўлены таксама 55.000 экзэмпляраў падручніка Ульянінскага, праграмы для гарадзкіх школ перапросткаў і 25.000 экзэмпляраў падручніка па партасьвеце Папова.

Прычынай гэтых залежаў зьяўляюцца ня толькі нікуды ня вартая работа Саюзтранспарту, але і арганізацыя работы на базе. Напрыклад, база робіць упакоўку атрыманых падручнікаў на працягу 3-4 дзён. Пасьля гэтага пасылаецца нарад Саюзтранспарту, які ў сваю чаргу забірае падручнікі таксама праз 4-5 дзён.

Такім чынам, па віне работнікаў базы і Саюзтранспарту падручнікі затрымліваюцца на цэлыя тыдні.

Партыйныя калектывы Белкаапсаюзу і Саюзтранспарту абавязаны ў самы кароткі тэрмін ліквідаваць тормазы перасылкі падручнікаў.

У сваю чаргу трэба прыняць усе меры для хутчэйшага прасоўваньня падручнікаў у БДВ, мэтадкоме і своячасовага выпуску іх з друку.

Пост «Зьвязды» Папінскі.

Зрыву заняткаў рабфаку БДУ дапусьціць нельга

Праз 24 дні павінны распачацца заняткі на рабфаку БДУ. Праз 15-20 дзён у Менск павінны прыехаць больш 400 студэнтаў і новапаступаючых на рабфак. Аднак па «милости» гарсавету гэтыя людзі павінны будуць ашукацца на вуліцы.

У свой час гарсавет вынес пастанову, каб інтэрнат рабфаку забраць пад гасьцініцу, прадастаўшы памяшканьне пад інтэрнат у другім месцы горада.

Першая частка пастановы гарсаветам выконваецца. Трэці і чацьверты паверх былога інтэрнату рабфаку рамантуюцца пад гасьцініцу, але пра другую частку сваёй-жа пастановы гарсавет мусіць забыўся. Памяшканьне пад інтэрнат рабфаку дагэтуль не прадастаўлена.

Мы патрабуем ад гарсавету, каб былі прыняты ўсе меры для адпраўканьня будынку пад інтэрнат. Зрыву навучальнага году рабфаку БДУ дапусьціць нельга.

Фрыд.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

АБ ХОДЗЕ ДРУКАВАНЬНЯ ПАДРУЧНІКАЎ І ПРАГРАМ ДЛЯ ШКОЛ НАЦМЕНШАСЬЦЯЙ ПА БДВ

НАЗВА ПАДРУЧНІКА	Кірэйсія: Усяго	Кірэйсія: Выйшла з друку	Кірэйсія: У мэтадкоме	Кірэйсія: У аўтараў	Польшча: Усяго	Польшча: Выйшла з друку	Літоўсія: Усяго	Літоўсія: Выйшла з друку	Літоўсія: У аўтараў	Латысія: Усяго	Латысія: Выйшла з друку	Латысія: У аўтараў
Для І-га канцэнтру	8	2	1	—	5	4	5	—	4	2	—	2
» ІІ-га канцэнтру	10	5	—	5	5	2	—	—	—	—	—	—
Ліквпункты і школы малапісьменных	1	—	—	—	2	2	—	—	—	—	—	—
Усяго	19	7	1	5	12	8	5	—	4	2	—	2
Праграмы												
Для І-га канцэнтру	2	—	—	—	2	—	—	—	—	—	—	—
» ІІ-га канцэнтру	3	1	—	—	2	—	—	—	—	—	—	—
Усяго	5	1	—	—	4	—	—	—	—	—	—	—

УВАГА: У выводы паказана толькі тая колькасьць падручнікаў, якая друкуецца ў БДВ. Каля 50 проц. падручнікаў для школ нацменшасьцяй друкуецца ў выдавецтвах УССР і Цэнтравыдавецтве.

ПАРТ'ЯЧЭЙКІ АБЫХОДЗЯЦЬ ПЫТАНЬНЕ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ

Слуцкія райарганізацыі скончылі 2-дэкаднік трывогі з даволі мізэрнымі вынікамі. Гэтыя вынікі нездавальняючыя галоўным чынам таму, што большасьць партыйных ячэек пытаньням навучальнага году амаль не аддаюць увагі.

Між тым па асобных вучастках і асабліва ў пытаньнях школьнага будаўніцтва справа знаходзіцца ў падзвычай дрэнным становішчы. У слуцкім раёне да пачатку навучальнага году павінна быць пабудавана 8 школ. Пры цяперашніх тэмпах работы, могуць быць скончаны толькі дзьве. Партыйныя ячэйкі ў большасьці пытаньне будаўніцтва абыходзяць.

Як прыклад напляваўцельскіх адносін да падрыхтоўкі навучальнага году можна прывесьці кіраўніцтва парт'ячэйкі Сампрамсаюзу. Да камбінату Сампрамсаюзу прымацована 4-ая школа. Загадчык гэтай школы дзесяткі раз хадзіў да сакратара парт'ячэйкі тав. Бугрова з просьбай дапамагчы ў падрыхтоўцы да навучальнага году і ў прыватнасьці паладзіць справу палітхнізацыі. Замест дапамогі загадчык школы атрымаў адказ: «Пачакай са сваёй школай, я займаюся калектывізацыяй».

Гэты адказ характэрызуе адносіны да пытаньняў культурнага будаўніцтва ня толькі кіраўніка парт'ячэйкі Сампрамсаюзу. У раёне можна пазначыць не адну парт'ячэйку, якая лічыць, што справа падрыхтоўкі да навучальнага году ня варта абмеркаваньня на бюро і агульным сходзе ячэйкі.

Райком КП(б)Б вынес ня дрэнную пастанову аб падрыхтоўцы да навучальнага году. Ён абавязаў прыняць пытаньні ячэйкі і іх кіраўніцтву Бугрова ўзяцца за рэалізацыю гэтай пастановы.

Брыгадзір Райштабу.

ДВУХДЭКАДНІК ПРАСПАЛІ

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі Дубровенскага раёну праспалі 2-хдэкаднік па ліквідацыі прарываў у культбудаўніцтве.

На сёнешні дзень падрыхтоўка да навучальнага году разгортваецца надзвычай марудными тэмпамі.

Райпрафсавет накіраваў па гэтым пытаньні брыгады ў сельсаветы, але з прычыны дрэннага інструктажу і безадказнасьці шмат якіх брыгадзіраў работа з месца не кранулася. Нічога таксама не зрабілі вылучаныя райкомам па правядзеньні дэкады па горадзе т. т. Левін, Дзям'янаў і Лабачоў.

Пытаньні культурнага будаўніцтва райарганізацыямі, як відаць, з вышэйпрыведзеных фактаў, недаацэньваюцца і пастановы партыі па пытаньні навучальнага году ігнаруюць. З гэтай прычыны пастаўлена пад просту пагрозу зрыву будаўніцтва і школьны рамонт.

У раёне яшчэ не прыступілі да выкананьня пастановы ЦК КП(б)Б аб скіраваньні адзінага пляну культбудаўніцтва.

Да гэтага часу не праведзен вучот нісьменных і малапісьменных па 15 вёсках і нават на Дняпроўскай мануфактуры.

Райком КП(б)Б павінен прывесьці парт'ячэйкі ў рух баявой работы па пытаньнях навучальнага году. Пагроза зрыву павінна быць адвернута.

ЧАРНЯЎСКІ.

АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫЯ ПЕРАВОЗКІ СУСТРЭЦЬ ВА УСЕУЗБРАЕНЫМ

АДКРЫЦЬ СЭМАФОРЫ НОВАМУ УРАДЖАЮ

ТРАНСПАРТ БССР НЕ ПАДРЫХТАВАЎСЯ ДА АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК. У ВІЦЕБСКУ 34 ПАРАВОЗЫ НЕ АДРАМАНТАВАНЫ. СПАРАНАЯ НЕ ЗАМАЦАВАНА. НА АРШАНСКІМ ВУЗЛЕ РАСТУЦЬ ПРАГУЛЫ. КЛІЕНТУРА БЕЗАДКАЗНА АДНОСІЦЦА ДА ВЫКАРЫСТАНЬНЯ РУХОМАГА СКЛАДУ. ПЛЯНЫ ПЕРАВОЗАК ВАНДРУЮЦЬ ПА ГАБІНЭТАХ

Плян асеньня-зімовых перавозак павінен быць выканан. Мацней удар па апартуністычнай бязьдзейнасьці, па безадказнасьці

Транспарт БССР уступае ў самы адказны перыяд сваёй работы—асеньня-зімовыя перавозкі.

Ці падрыхтаван-жа транспарт да асеньня-зімовых перавозак? Гэтаму пытаньню была прысьвечана значная частка апошняга пасяджэньня прэзыдыуму ЦСПСБ. Выступленьні ўпаўнаважанага НКШЗ тав. ЭГЛЕ, старшыні Белбюро ЦК чыгуначнікаў тав БЕРЗІНГА і прадстаўніка Саюзтрансу — тав. БІРГЕРА паказалі, што транспарт да асеньня-зімовых перавозак фактычна НЕ ГАТОЎ.

У чым справа?

Аздараўленьне перавозачнага парку, ліквідацыя абязьлічкі і пераход на спаранную язду ўсё яшчэ не праводзіцца з неабходнай рашучасьцю. Месцамі абязьлічка зноў падымае галаву. У радзе масц ужываюцца розныя камбінацыі ўліку, займаюцца фактычным ашуканствам, як гэта было ў АРШАНСКІМ раёне, каб толькі давесьці, што «спаранка праведзена на 100 проц.» Не справе-ж па Аршанскім раёне, напрыклад, у чэрвені было 52 проц. зрываў спаранай, а по таварным руху за першую пяцідзённую ліпеня — 20,5 проц. зрываў, а другую пяцідзённую—4,4 проц., трэцюю пяцідзённую — 8.3 і чацьвертую пяцідзённую — 38 проц., зрываў. Па ВІЦЕБСКІМ раёне з 1 па 20 ліпеня было зрываў спаранай па машынстах — 35 проц., па качагарах —70 проц. Па ЖЛОБІНЕ— у першай дэкадзе ліпеня быў 131 зрыў спаранай, у другой дэкадзе—174.

Ні ў адным раёне БССР процант хворых перавозаў ня зьменшан да нормы, вызначанай НКШЗ. Дырэктыва партыі і НКШЗ аб тым, каб да 15 жніўня прапусьціць праз аздаравіцельны рамонт 90 проц. паравозаў, НЯ ВЫКАНАНА. На 1 жніўня па ВІЦЕБСКІМ вучастку не адрамантавана 34 паравозы. Такі-ж малюнак і па ГОМЕЛІ.

Жыве яшчэ абязьлічка у саміх ДЭПО ў арганізацыі працы, інструманты, варштаты НЯ МАЮЦЬ пастаянных кадраў, пашпартызацыя варштатаў НЕ ПРАВЕДЗЕНА.

Вагонны парк па многіх дэпо выпаў нават з плянаў падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак. У сувязі з гэтым процант хворых вагонаў павышаецца. Аздараўленьню вагоннага парку не адданецца ўвагі. Вагон усё яшчэ застаецца ў палоне абязьлічкі.

Пляніраваньне перавозак—адно з вузкіх месц. Па цэнтральных магістралях БССР ужо фактычна пачалося прасоўваньне сэзонных грузаў, а гаспадарчыя арганізацыі яшчэ дагэтуль НЕ ДАЛІ канкрэтных заявак. Летнія перавозкі САРВАНЫ. Лесбел на працягу двох месяцаў не прад'яўляў грузаў, а цяпер, калі пачаліся асеньня-зімовыя перавозкі, дае патрабаваньні на летнія грузы. З-за адсутнасьці плянаў і непрад'яўленьня грузаў штодзенна па МБВ і Зах. чыгунках «гуляюць» у пегды каля 1.000 вагонаў.

Клієнтура ўвесь час дае нерэальныя пляны і гэтым дэзорганізуе работу транспарту. Па ВОРШЫ ў чэрвені клієнтура патрабавала 6.700 вагонаў, выкарыстана-ж 2.302 вагоны — 34 проц., За мінулы месяц Лесбел недагрузіў 567 вагонаў, Белдартранс—384, Бібрудаб'яднаньне — 200 і сама МБВ чыгунка — 600.

Гэта замест таго, каб выкарыстаць летні час для перавозкі такіх масавых грузаў, як лес, будаўнічыя матар'ялы і г. д. і тым самым палегчыць работу транспарту ў перыяд інтэнсыўных збожжавых і іншых асеньня-зімовых перавозак з такімі бездакледнымі адносінамі да выкарыстаньня рухомага складу з боку клієнтуры трэба пакончыць.

Ячэйкі па пляніраваньні перавозак пры наркаматах і іншых установах бязьдзейнічаюць. Пляны складаюцца неабгрунтаваныя. ПЛЯНЫ НЕ ДАВЕДЗЕНЫ ДА РАБОЧЫХ МАС І ДАГЭТУЛЬ ВАНДРУЮЦЬ ПА ГАБІНЭТАХ і КАНЦЫЛЯРЫЯХ.

Марудна выконваюцца і дырэктывы аб пераводзе транспартнай гаспадаркі на гаспадарчы разрахунак. Па ВОРШЫ, ЛЕПЕЛІ і БАРЫСАВЕ пераведзены на гаспадарчы разрахунак дэпо і 10 паравозаў, а па ВІЦЕБСКУ — толькі 8 паравозаў. Між тым, сходы машыністаў у Воршы ў разацюцьі патрабавалі, каб у бліжэйшы час было пераведзена на гаспадарчы разрахунак ня менш 50 проц., а ў ВІЦЕБСКУ машыністы патрабуюць стопроцантнага выкананьня дырэктывы аб пераводзе на гаспадарчы

БРЫГАДЫ МАСЛАВА і ДЗЕРГАЧОВА

першымі датэрмінова выканалі сэзонны плян торфаздабычы

СЭЗОН КАНЧАЕЦЦА,

патроіць тэмпы барацьбы за торф!

Вынікі трохмесячнай работы торфяной прамысловасьці БССР зусім нездавальняючыя. Выкананьне праграмы торфаздабычы пад пагрозай.

Заданьне ў 700.000 тон торфу застаецца, ня гледзячы на хуткае сканчэньне сэзону торфаздабычы, далёка нявыкананым.

На 8 жніўня па 22 заводах Белторфу здабыта 271.008,0 тон торфу, што складае толькі 38,7 проц. сэзоннага пляну.

Гэтыя лічбы з усёй нагляднасьцю гавораць аб тым, што кіраўнікі многіх торфазаводаў, нізавыя партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя і інш. арганізацыі, трымутнікі тых прадпрыемстваў, якія зьяўляюцца спажыўцамі торфу, і па сёньняшні дзень недавацэньваюць усёй важнасьці здабычы торфу, ігнаруюць важнейшыя пастановы ЦК КП(б)Б і СНК аб стопроцантным выкананьні ў вызначаны тэрмін праграмы торфаздабычы кожным заводам, кожным торфараспрацоўчым вучасткам пасобку.

МЭХАНІЗАЦЫЯ—ГЭТА САМАЕ ВУЗКАЕ МЕСЦА ТАРФЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

ФРЭЗЭРНАЯ ЗДАБЫЧА—АДЗІН З АСНОЎНЫХ ВІДАЎ МЭХАНІЗАВАНЫХ СПОСАБАЎ ЗДАБЫЧЫ ТОРФУ—УВЕДЗЕН ДАЛЕКА НЕ НА ЎСІХ ЗАВОДАХ.

Між тым прыклад торфазаводу Давыдаўка, які па ініцыятыве дырэктара тав. Маслова цалкам мэханізаваў спосабы па фрэзэрнай здабычы (вярочка і зборка ў вапы) і дабіўся скарачэньня патрэбнасьці ў рабочай сіле на 70 проц., сьведчыць аб найвялікшай перавазе мэханізаваных спосабаў здабычы торфу.

Да канца сэзону засталося 13 дзён. Гэтыя дні трэба ператварыць у болевы штурм прарываў торфаздабычы.

Трэба выкарыстаць усе мэханізаваныя спосабы торфаздабычы, якія дапамогуць фарсаваць выкананьне прамфінпляну торфянай прамысловасьці.

Вядучы ўпартую барацьбу за 700 тысяч тон торфу зараз асноўнай задачай зьяўляецца сушка і ўборка здабытага торфу. На палёх сьцілкі торфазаводаў ляжаць мільёны непаднятых тарфяных цаглін, якія патрабуюць безадкладнай сушкі і ўборкі.

На торфазаводзе «Шлях сацыялізму», які забясьпечвае апалам папяровую фабрыку «Герой працы», на палёх сьцілкі ляжыць 20.000 тарфяных цаглін малога торфу і 30.000 цаглін здабытых машына-фармовачным спосабам. Гэткае становішча мы маем амаль на ўсіх торфазаводах без выключэньня.

ПАТРЭБНА БЕЗАДКЛАДНАЯ МАБІЛІЗАЦЫЯ ЎСІХ СІЛ НА ФРОНТ УБОРКІ І СУШКІ ТОРФУ, З ТЫМ, КАБ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ СВАЯЧАСОВУЮ ВЫВАЗКУ АПОШНЯГА ПРАДПРЫЕМСТВАМ, ЯКІЯ ВЫКЛЮЧНА ПРАЦУЮЦЬ НА ТАРФЯНЫМ АПАЛЕ.

Зараз павінна быць шырока выкарыстаны сапраўды ўдарныя мэтады работы героў тарфянога Перакопа, брыгадзіраў Маслава і Дзергачова, якія дабіліся датэрміновага выкананьня сваіх сэзонных пляноў торфаздабычы, узялі на буксір другія машыны, высунулі свае сустрэчныя пляны торфаздабычы, за якія вядуць упартую барацьбу.

Патрэбна шырокая пралетарская дапамога торфазаводам прадпрыемстваў, і ў першую чаргу тых фабрык, заводаў, якія зьяўляюцца непасрэднымі спажыўцамі торфу.

ДНІ, ЯКІЯ ЗАСТАЛІСЯ ДА СКАНЧЭНЬНЯ СЭЗОНУ, ПАВІННЫ СТАЦЬ ДНЯМІ БАЯВЫХ УДАРНЫХ ТЭМПАЎ РАБОТЫ, ДНЯМІ ЭКЗАМЭНУ ДЛЯ ЎСІХ ТАРФЯНІКОЎ НА ЎМЕНЬНЕ ЗМАГАЦЦА ЗА ТОРФ.

Ал.

ГЕРОІ ТАРФЯНОГА ПЕРАКОПА

Тэмпы работы брыгад Маслава і Дзергачова—усім тарфянікам БССР

ГОМЕЛЬ, 10. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ ПАКАЗВАЕ ПРЫКЛАД САПРАЎДЫ БАЯВОЙ РЭАЛІЗАЦЫІ ЗАДАЧ, ЯКІЯ ВЫСУНУТЫ Ў ПРАМОВЕ ТАВ. СТАЛІНА І ПАСТАНОВЫ ЦК І СНК БССР АБ ТОРФАРАСПРАЦОЎКАХ.

З ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НА ДАПАМОГУ Ў ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВУ ТОРФАЗДАБЫЧЫ БЫЛІ КІНУТЫ НА ТОРФЗАВОДЫ ДЗЕСЯТКІ РАБОЧЫХ БРЫГАД, НА ТОРФАРАСПРАЦОЎКІ ВЫЙШЛІ СОТНІ ПІЯНЭРАЎ І КАМСАМОЛЬЦАЎ.

ЗАРАЗ ТОРФАЗАВОДЫ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ ДАБІЛІСЯ ЗНАЧНАГА ПЕРАЛОМУ Ў СВАЁЙ РАБОЦЕ І ПА-БАЯВОМУ ЗМАГАЮЦЦА ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВАЎ.

ТОРФАЗАВОД «ДАВЫДАЎКА», ЯКІ НА 19 ЛІПЕНЯ Г. Г. ДАСЯГНУЎ ВЫКАНАНЬНЯ СЭЗОННАГА ЗАДАНЬНЯ ЎСЯГО НА 34,4 ПРОЦ., НА 6 ЖНІЎНЯ ДАЎ 52,2 ПРОЦ. СЭЗОННАЙ ПРАГРАМЫ.

ЛІКВІДАЦЫЯ АБЯЗЬЛІЧКІ І ЎРАЎНІЛАЎКІ Ў РАБОЦЕ БОЛЬШАСЬЦІ МАШЫН І БРЫГАД, ПРАВІЛЬНАЯ РАССТАНОЎКА РАБОЧАЙ СІЛЫ ЎЗНЯЛА НОВУЮ ХВАЛЮ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА СЯРОД ТАРФЯНІКАЎ І ТАРФЯНІЦ.

БРЫГАДА ЛЕПШАГА ЎДАРНІКА—ГЕРОЯ ТАРФЯНОГА ПЕРАКОПУ—ТАВ. МАСЛАВА, ЯКІ МАЕ 13-ГАДОВЫ СТАЖ РАБОТЫ Ў ТАРФЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ПЕРШАЯ Ў БССР 26 ЛІПЕНЯ ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЛА СВАЁ СЭЗОННАЕ ЗАДАНЬНЕ. БРЫГАДА ЗАРАЗ УЗЯЛА НА БУКСІР МАШЫНУ ДРУГОЙ БРЫГАДЫ, ПАСТАВІЎШЫ ПЕРАД САБОЮ ЗАДАЧУ—У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ДАБІЦЦА СТОПРОЦАНТНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ГЭТАЙ БРЫГАДАЙ СЭЗОННАГА ЗАДАНЬНЯ.

ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ Ў АПОШНІЯ ДНІ ПАКАЗВАЕ І ТОРФАЗАВОД «ЗАКРАШЫНСКІ МОХ». НА 6 ЛІПЕНЯ СЭЗОННАЕ ЗАДАНЬНЕ ВЫКАНАНА НА 68,2 ПРОЦ. 5 ЖНІЎНЯ ЗДАБЫТА 137,0 ТОН ТОРФУ, ШТО СКЛАДАЕ 113,8 ПРОЦ. ДЗЕННАГА ЗАДАНЬНЯ.

ПАМІЖ БРЫГАДАМІ РАЗГАРНУЛАСЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ САЦСПАБОРНІЦТВА НА ХУТЧЭЙШАЕ ВЫКАНАНЬНЕ СЭЗОННАЙ ПРАГРАМЫ.

РЭКОРД ПАБІЛА БРЫГАДА ПАРТЫЗАНА ДЗЕРГАЧОВА, ЯКАЯ, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ЗНАЧНАЕ СПАЗЬНЕНЬНЕ ПАЧАТКУ СЭЗОНУ, ТОЛЬКІ ДЗЯКУЮЧЫ ВЫСОКАМУ ЭНТУЗІЯЗМУ ЎСІХ РАБОЧЫХ БРЫГАДЫ, ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЛА СВАЁ СЭЗОННАЕ ЗАДАНЬНЕ Ў 2.400 ТЫСЯЧ ТАРФЯНЫХ ЦАГЛІН.

БРЫГАДА ДЗЕРГАЧОВА ЗАМАЦАВАЛА СЯБЕ ДА КАНЦА СЭЗОНУ І ВЫСУНУЛА СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН ТОРФАЗДАБЫЧЫ, ЗА ЯКІ ВЯДЗЕ ЎПАРТУЮ БАРАЦЬБУ.

ФРЫД.

ЗРУХ—ЯШЧЭ НЕ ПЕРАМОГА

ЗАМАЦАВАЦЬ ПЕРАЛОМ, РАЗЬВІВАЦЬ ТЭМПЫ!

1. Доўг рос з месяца ў месяц

У першым квартале Гомсельмаш павінен быў выпусьціць малыін на 1.968 тыс. руб., фактычна-ж выпушчана толькі на 1.048 тыс. руб. Запазычанасьць складае 920 тыс. руб.

У другім квартале малюнак не палепшыўся. Прарыў паглыбіўся. Завод заканчыў паўгодзьдзе з новым прыростам доўгу. Так, у другім квартале паводле пляну трэба было выпусьціць прадукцыі на 3.090 тыс. руб., а выпушчана-ж усяго на 1.800 тыс. руб. Запазычанасьць —1.290 тыс. руб.

Разам доўг, з якім скончыў Гомсельмаш першае паўгодзьдзе, складае суму ў 2.210 тыс. руб.

У пераводзе-ж на машыны, запазычанасьць па другім квартале мае наступны малюнак.

Заданьне ПА СІЛАСАРЭЗКАХ складала 2.300 малыін, выпушчана—1.742, доўг—558, па СЯЧКАРНЯХ: заданьне—1.200, выпушчана—110, доўг—1.090; па БУЛЬБАМЫЙКАХ: заданьне—600, выпушчана—33, доўг—567; па БУЛЬБАСАРТО КАХ: заданьне — 100, выпушчана—32, доўг—68.

У сярэднім гадавы сабекошт прадукцыі павінен быў быць зьніжан на 12 проц. У рэчаіснасьці-ж у другім квартале завод меў павялічэньне сабекошту на 23 проц.

Іншыя паказальнікі першага паўгодзьдзя маюць ня лепшы выгляд. У красавіку—чэрвені завод меў 2.315 варштатагадзін прастояў. Прагулы ў першым квартале складалі 2.284 рабочых дзён, у другім квартале—1.619 дзён. Агулам за першае паўгодзьдзе людзі прагулялі 3.639 рабочых дзён, або 10 каляндарных год.

У першым паўгодзьдзі завод палічваў 1.446 рабочых, з іх ударнікаў—толькі 917 чалавек. На прэміраваньне лепшых ударнікаў і за лепшыя рацыяналізатарскія прапановы выдаткавана 17 тыс. руб., а скарыстана толькі капя 6 тыс. рублёў.

2. Карэньні прарываў

Дзе-ж карэньні прарыву ў першым паўгодзьдзі? Дзе прычыны такога пагражаючага і хранічнага невыкананьня зытворчай праграмы?

Іх, гэтых прычын, на заводзе было некалькі.

Першая і галоўная «прычына заключаецца ў тым, што за апошні час умовы разьвіцьця прамысловасьці зьмяніліся ў корані, стварылася новая абстаноўка, якая патрабуе новых прыёмаў кіраўніцтва, а некаторыя нашы гаспадарнікі замест таго, каб зьмяніць прыёмы работы, усё яшчэ працуюць па-старыцы. Справа, значыцца, у тым, што новыя ўмовы разьвіцьця прамысловасьці патрабуюць работы па-новаму, а некаторыя нашы гаспадарнікі не разумеюць гэтага і ня бачаць таго, што трэба кіраваць цяпер па-новаму» (Сталін).

Гомсельмашаўскія гаспадарнікі прапазалі і кіравалі па-старанцы. На чале заводу доўгі час сталі махровыя апартуністы, якія, як чарапахі, паварочваліся там, дзе патрэбна была тібкасьць, націск, шпаркасьць арыентыроўкі, бальшавіцкія тэмпы.

Цэхі выконвалі прамфінплян толькі на 57 проц., а апартуністычнае кіраўніцтва спакойна канстатавала гэты факт, спакойна выводзіла крывыя зьніжэньня выкананьня праграмы на дыяграмах, апраўдваючыся тым, што «заводзкі плян зусім нерэальны».

Халадком і непаваротлівасьцю, чарапашымі тэмпамі і кракадзілавымі сьлязьмі, вышуквальным аб'ектыўных прычын і канстатаваньнем фактаў, якія адбыліся, падмяняліся ўпартая работа па выкананьні вытворчай праграмы.

Доўгі час лінія гаспадарчага кіраўніцтва заводу была дыяметральна-процілегай тэй лініі, якая праводзіцца партыяй і рабочай клясай і за якую актыўна змагаецца рабочы калектыў Гомсельмашу.

Сельмашаўскія апартуністы Ралкіны, Фэльдманы і іх ніжэйшыя падпявалы, усе гэтыя «калянартыйныя» абываталі і «мудрыя шчедрынскія пяшкуры» каменьнем заслі ў канторы, габінэты і канцылярыі і адтуль кіравалі прадпрыемствам «паогул», «з паветра». Сыгналы і патрабаваньні рабочых мас заставаліся непачутымі і не ператвараліся ў жыцьцё. Фалкіны і Фэльдманы мала ведалі цэхавых работнікаў, мала вучылі іх і яшчэ менш вучыліся самі. Заводзкія апартуністы сталі цьвёрдакуры мі да такой ступені, што ніякая гарачая крытыка не праймала іх, ня брала за жывое і не хвалявала.

Такое кіраўніцтва прывяло завод у абдымкі бадай самага страшэннага бітва нашай прамысловасьці на даным этапе яе разьвіцьця—да абязьлічкі.

«Абязьлічка ёсьць адсутнасьць усякай адказнасьці за мэханізмы, за варштаты, за інструменты... Абязьлічка зьяўляецца такім бічом прамысловасьці, які стварае пагрозу для ўсіх нашых вытворчых і арганізацыйных дасягненьняў на прадпрыемствах» (І. Сталін).

На Гомсельмашы абязьлічка набыла пагражаючыя разьмеры. Людзі не атрымлівалі канкретных даручэньняў, цьвёрда акрэсьленых вучасткаў работы і ніхто за іх не адказваў. Майстры і брыгадзіры ня ведалі сваіх праў і абавязкаў. На розныя лады скланяліся агульныя лічбы—30 сіласарэзак, 15 сячкарань і г. д.,—але брыгады і людзі ня ведалі, што ім трэба абавязкова зрабіць, каб праграма была абавязкова выканана.

Гэта асноўная прычына. Гэта прычына ўсіх прычын. Ад няўменьня прадаваць і кіраваць па-новаму, ад абязьлічкі бяруць пачатак карэньні і ўсіх астатніх прычын прарыву: дрэнная арганізацыя працы, прагулы, прастоі, брак, міжцэхавыя нязвязкі і г. д.

3. Барацьба за пералом

Пастановы чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і асабліва прамова тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў абумовілі першыя зрухі да заваяваньня пералому ў рабоце заводу.

Прапрацоўка пастаноў пленуму ЦК партыі зьявілася магутнай зброяй барацьбы з апартуністычнай лініяй гаспадарчага кіраўніцтва, моцным сродкам мабілізацыі рабочых Гомсельмашу на ліквідацыю прарываў і пакрыцьцё запазычанасьці. Прапрацоўка суправаджалася радам канкретных абавязацельстваў і канкретных прапаноў па рацыяналізацыі вытворчасьці.

Хвалю гераізму, энтузіязму і творчага ўздыму выклікала прамова тав. Сталіна. Шырокая прапрацоўка сталінскіх пажаданьняў, якая праходзіла на працягу некалькіх дзён, ператварылася ў бальшавіцкі штурм прарыву і міжцэхавых непаладкаў.

Партыйны калектыў заводу і большая частка цэхавых ячэек сталі на чале актыўнасьці рабочых, умела скарысталі гэты момант і цьвёрда павялі завод на заваяваньне першых подступаў да пералому.

Апартуністычнае кіраўніцтва было зьнята з работы. Партарганізацыя ўдарыла па фактах апартуністычнай практыкі і пераключылася на рэалізацыю задач, паказаных у прамове тав. Сталіна.

У выніку прапрацоўкі прамовы Сталіна на Гомсельмашы зьнішчана абязьлічка і праводзіцца работа па барацьбе з ураўнілаўкай, вызначаюцца вядучыя прафэсіі, а таксама больш цяжкія і больш лёгкія работы, каб у адпаведнасьці з гэтым правільна арганізаваць зарплату.

Палепшана сувязь з калгасамі падшэфнага сельсавету і заключаюцца ўмовы на забесьпячэньне рабочай сілай ліцейнага цэху.

Пераводзіцца на перапыны 6-дзенны тыдзень зборачны, сталярны, дробна-кацельны і малярны цэхі. Кавальскі і ліцейны пакінуты на пяцідзёўцы, а ў мэханічным замацаван 4-дзенны графік.

Для забесьпячэньня стопроцантнага выкананьня прамфінпляну ліцейшчыкі ў парадку сацыялістычнага суботніку папырылі фармовачны пляц і падрыхтавалі для яго зямлю.

72 аборшчыкі на сячкарнях замацавалі сябе за пэўнымі варштатамі і вузламі да канца пяцігодкі.

Рэзка ўзрасла колькасьць рацыяналізатарскіх прапаноў. Узьнялася прадукцыйнасьць працы і палепшылася якасьць прадукцыі.

Апошняя дэкада ліпеня зьяўляецца пераломнай у барацьбе за стопроцантнае выкананьне дзённага заданьня па сіласарэзках. 25-31 ліпеня выпускалася па 30-31 сіласарэзцы (дзённае заданьне —30) і толькі 28 і 29 ліпеня, па віне кавальскага і мэханічнага цэхаў, выпуск машын зьнізіўся да 26 штук.

З выпускам сячкарань і іншых машын (бульбасартоўкі і бульбамыйкі) справа стаіць усё яшчэ дрэнна. Праўда, у ліпені выпуск сячкарань падцягнут да 8 штук у дзень (у чэрвені больш 4 х ніколі ня было), але-ж дзённае заданьне ў 15 машын яшчэ ні разу ня выканана.

Цяпер задача заводу—просты абавязак рабочых, адміністрацыі і інжынэрна-тэхнічнага персаналу—ня зьніжаць дасягнутых тэмпаў, а ўсямерна іх разьвіваць, даводзячы да такой ступені, якая забясьпечыць заводу поўную перамогу.

Што-ж для гэтага патрэбна? Якія першачарговыя задачы стаяць перад Гомсельмашам па замацаваньні пералому і далейшым паскарэньні тэмпаў?

Першая і галоўная задача—гэта самае няўхільнае і пасьлядоўнае правядзеньне ў жыцьцё шасьці задач, паказаных у прамове тав. Сталіна. З ператварэньнем у жыцьцё гэтых задач самым цесным чынам зьвязана выкананьне вытворчай праграмы.

На аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня 6-ці сталінскіх паказаньняў Гомсельмаш павінен безадкладна вырашыць дзьве асабліва ўдарныя задачы, вырашыць два асабліва адсталых вучасткі—гэта: арганізацыя працы і паляпшэньне культурна-бытавых умоў рабочых.

На Сельмашы і раней былі, а зараз колькасьць іх значна павялічылася, сапраўдныя ўдарныя брыгады, сапраўдныя людзі—героі працы. Яны, гэтыя людзі-героі, не адступалі. Яны акапаліся упартасьцю і аддамасьцю рабоце і ўсямерна, наколькі было сіл, стрымлівалі апартуністычнае адступленьне. Яны на чале з лепшымі камуністамі заводу непахісна ішлі бальшавіцкай дарогай і рашуча змагаліся з апартуністычнай лініяй старых гаспадарнікаў.

У барацьбе за поўнае выкананьне дзённых заданьняў рабочыя часта выключна па сваёй ініцыятыве, адмаўляюцца ад сваіх выхадных дзён, працуюць па некалькі гадзін звыш рабочага часу, адданасьцю і гераізмам, вывучэньнем тэхнікі заваёўваюць новыя машыны.

Аднак, трэба стварыць такія ўмовы, трэба дабіцца такой выразнай арганізацыі працы, пры якой рабочы ў цьвёрда-акрэсьлены час мог-бы даць найбольшы вытворчы эфэкт, выканаць з перавышэньнем свой прамфінплян і забясьпечыць выкананьне праграмы цэлым заводам.

Усямерна разьвіваючы тэмпы работы ў непасрэдны рабочы час, савецкія заводы і фабрыкі і ў першую чаргу іх партыйныя калектывы павінны асабліва ўпарта змагацца за найбольш разумнае і карыснае скарыстаньне рабочым яго па-за рабочага часу.

Тут нельга спасылацца на ранейшыя ўмовы, на ўмовы пройдзеных этапаў. «Толькі гніпыя і наскрозь пратухлыя людзі могуць захапляцца спасыланьнямі на мінулае. Трэба выходзіць ня з мінулага, а з узрастаючых патрабаваньняў рабочых у даны момант. Трэба зразумець, што ўмовы існаваньня рабочых зьмяніліся ў нас у корані. Рабочы зараз—ня тое, што раней. Цяпершні рабочы, наш савецкі рабочы, хоча жыць з задавальненьнем усіх сваіх мастар'яньных і культурных патрабаваньняў. Ён мае на гэта права і мы абавязаны забясьпечыць яму гэтыя ўмовы» (Сталін).

На Гомсельмашы гэтых умоў яшчэ няма і нічога не рабілася, каб іх, гэтыя ўмовы стварыць. Наша вызная брыгада ня раз пісала аб тых блячынствах, якія маюць месца ў культурна-бытавым абслугоўваньні рабочых. Асабліва вузкімі месцамі зьяўляюцца: кватэрныя ўмовы, культурна-масавая работа і абслугоўваньне рабочых сталоўкай і буфэтам.

У гэтых адносінах справа часта мяжуецца з простымі зьдзекамі над рабочымі, бо нельга ж інакш назваць такое становішча, калі ёсьць такія выпадкі, калі рабочыя па гадох жывуць у разбураных кватэрах, або зусім без кватэр, а ў сталоўцы ніколі ня бывае шклянкі вады.

Палепшаньне бытавых умоў рабочых — самая базавая задача для Гомсельмашу і на яе вырашэньні павінна быць зараз-жа мабілізавана максымум увагі, сіл і сродкаў.

4. Замацаваць пералом, ажыцьцявіць вытворчую праграму

Чэрвень і ліпень у выніку ўпартай барацьбы рабочых і інжынэрна-тэхнічнага персаналу, пад кіраўніцтвам калектыву КП(б)Б, пры актыўнай дапамозе выяной брыгады «Зьвязды», прынесьлі Гомсельмашу ПЕРАЛОМ, шчыльна падвялі завод да стопроцантнага выкананьня дзённага заданьня па асноўным відзе прадукцыі—сіласарэзках.

Пералом заваёўваўся напружанымі бальшавіцкімі тэмпамі. Але для таго, каб дасягнуты пералом замацаваць Гомсельмашу неабходна яшчэ больш разьвіваць тэмпы ўдарнай работы.

Тут нельга ні на адну хвіліну забываць аб тым, што «мы адсталі ад перадавых краін на 50-100 год. Мы павінны прабегчы гэтую адлегласьць за 10 год. Або мы зробім гэта, або нас сьмяцуць» (Сталін).

Другое паўгодзьдзе Гомсельмаш пачаў разгонам. У ліпені завод разганяўся і да пачатку жніўня пачаў разьвіваць тэмпы.

5. Забясьпечыць Гомсельмаш сырцом і матар'яламі

Вытворчая праграма Гомсельмашу з кожным новым месяцам павялічваецца.

Але Белмэталяб'яднаньне, павялічваючы вытворчую праграму, павінна разам з гэтым прапарцыянальна павялічваць і забесьпячэньне заводу сырцом і матар'яламі. Адсутнасьць патрэбных профіляў жалеза і патрэбнага інструменту ставіць завод пад пагрозу новага зрыву ў выкананьні прамфінпляну.

Яшчэ горш стаіць справа з заканчэньнем будаўніцтва заводу. Паасобныя новыя цэхі зусім гатовы і ня могуць быць пушчаны ў эксплёатацыю толькі таму, што няма патрэбнага электрычнага кабэля.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваіх пастановах абавязваюць ВСНГ закончыць будаўніцтва і абсталяваньне Гомсельмашу не позьней трэцяга кварталу 1932 году а тым, каб да гэтага часу завод быў канчаткова пушчан. Вялікае невыкананьне плянаў па будаўніцтве заводу за першае паўгодзьдзе багучага году ставіць пад пагрозу сваячасовы пуск Гомсельмашу, калі для гэтага на будуць цяпер-жа ўжыты самыя рашучыя захады.

6. Партыйную і прафсаюзную работу—у цэхі і брыгады

Партыйны калектыў Сельмашу ў апошні час дабіўся значнага пералому ў сваёй рабоце. Але гэты пералом яшчэ невыстарчальны і не рашаючы, ён яшчэ не адпавядае поўнасьцю тым задачам, што стаяць сёньня перад заводам, ён не забясьпечвае яшчэ заводу хуткага замацаваньня пералому ў барацьбе за прамфінплян.

Значна горш стаіць справа з прафсаюзнай арганізацыяй. Прафсаюзная арганізацыя не перабудавалася, стаіць у баку ад барацьбы за выкананьне вытворчай праграмы. Партыйны калектыў і прафсаюзная арганізацыя яшчэ, як сьлед, ня ўключыліся ў барацьбу-упартую і неадступную—за выкананьне пляну, яшчэ ня прыведзены ў рух усе «прыдавныя насы», не мабілізавана ўся рабочая маса заводу на творчую работу па-ўдарнаму.

Партыйную і прафэсыянальную работу трэба перабудаваць больш шпаркімі тэмпамі, перанесьці цэнтр яе цяжару ў цэх і брыгаду.

***

Гомсельмаш павінен ажыцьцявіць сваю праграму, машыны павінны быць зданы ў тэрмін.

ДЗЯМІД БОЙЧЫК.

Гомель, ліпень-жнівень.

Брыгада «Зьвязды».

ГОМСЕЛЬМАШ.

МАШЫНЫ—УБОРАЧНАЙ

Раўненьне на ліцейны цэх, які штодзенна ВЫКОНВАЕ ПРАМФІНПЛЯН

ВЫПУСК СІЛАРЭЗАК (ДЗЕННАЕ ЗАДАНЬНЕ—30)

5 ЖНІЎНЯ	6 ЖНІЎНЯ	7 ЖНІЎНЯ	8 ЖНІЎНЯ
30	29	27	30

ГОМСЕЛЬМАШ, 11 жніўня. Пералом у выкананьні вытворчай праграмы, заваяваны Гомсельмашам у канцы ліпеня, яшчэ цалкам не замацован. За час з 1 па 8 жніўня, толькі 1,5 і 8 дзённае заданьне выканана на 100%.

Галоўная прычына зрываў у рабоце заводу — нявыразная арганізацыя працы. Прастоі варштатаў і прагулы людзей не ліквідаваны. За ліпень месяц па 4-х цэхах (мэханічны, кавальны, зборачны і ліцейны) прагулы складаюць 291 дзень, або 2.037 рабочых-гадзін.

Вось яны, самыя злосныя прагульшчыкі і зрыўшчыкі прамфінпляну.

Па ліцейным цэху: Мяшкоў К.—прагуляў 10 дзён і Майсеенка — 12 дзён. Па мэханічным цэху — Кісель Язэп — прагуляў 13 дзён і ўцёк у Ленінград; Уласевіч — прагуляў 5 дзён і Нэстэраў — 5 дзён. Па зборачным цэху: Сідарэнка — прагуляў 5 дзён.

Адміністрацыя паасобных цэхаў і прафсаюзныя арганізацыі ня прымаюць рашучых вэхадаў па барацьбе з прагуламі і прастоямі.

ЛІЦЕЙНЫ ЦЭХ ДАБІЎСЯ НОВЫХ БУЙНЫХ ПЕРАМОГ І З ЖНІЎНЯ ПАЧАЎ ЦАЛКАМ ВЫКОНВАЦЬ СВОЙ ПРАМФІНПЛЯН.

Зусім дрэнна з калёсным жалезам. Увесь заводзкі двор застаўлен гатовымі сіласарэзкамі і з-за адсутнасьці калёс яны ня могуць быць адпраўлены.

Сілесная кампанія па краіне ў разгары. Ні адна машына не павінна заставацца на заводзкім дворэ. Трэба самым ударным парадкам забясьпечыць сіласарэзкі калёсамі і адправіць іх у саўгасы і калгасы.

КУПРЫЯНЧЫК

БОЙЧЫК

МАБІЛІЗАЦЫЯ СРОДКАЎ

Адстаючыя раёны павінны выйсьці на перадавыя пазыцыі фінансавага фронту

Ліквідаваць прарывы ў 16 раёнах

(НА НАРАДЗЕ ПРЫ НАРКАМФІНЕ БССР).

16 раёнаў БССР ганебна ня выходзяць з прарываў па мабілізацыі сродкаў. Выкананьне фінпляну гэтымі раёнамі складае 14-33 проц. заданьня.

Вось гэтыя раёны, месца ім на чорнай дошцы: БЯГОМЛЬСКІ, ВЕТКАЎСКІ, ВУШАЦКІ, ДУБРОВЕНСКІ, КЛІЧАЎСІ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ, ЛЕЛЬЧЫЦКІ, ПЯТРЫКОЎСКІ, ПРАПОЙСКІ, ТАЛОЧЫНСКІ, ТУРАЎСКІ, ЦЕРАХАЎСКІ, ЧАЧЭРСКІ, ШКЛОЎСКІ, ЖЫТКАВІЦКІ І ЕЛЬСКІ.

З матаю выяўленьня прычын гэтага недапушчальнага адставаньня, Наркамфін БССР скінуў нараду загадчыкаў райфа і прадстаўнікоў райвыканкомаў названых раёнаў.

На нарадзе выявілася, што асноўнай прычынай зрыву выкананьня фінпляну зьяўляецца апартуністычная бязьдзейнасьць раённых арганізацый, злачынная недавацэнка мабілізацыі сродкаў.

Барацьба за фінплян ва ўсіх гэтых раёнах носіць кампанейскі характар і зусім ня ўвязваецца з іншымі гаспадарча - палітычнымі кампаніямі. З боку райфа, райбанкаў і ашчаднас ня было праўлена ніякай ініцыятывы і самадзейнасьці ў справе мабілізацыі сродкаў.

Удзельнікі нарады ўзялі на сябе абавязак — НА ПРАЦЯГУ ЖНІЎНЯ ПОЎНАСЬЦЮ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫБЫ Ў ВЫКАНАНЬНІ ФІНПЛЯНУ. Пастаноўлена на працягу трэцяга кварталу спытаць чарговым адпачынкі работнікаў фінапаратаў названых раёнаў.

Улічваючы спадасьць фінансавых кадраў у адстаючых раёнах, Наркамфін дакіроўвае туды выпускнікоў 9-месячных фінансавых і ашчадных курсаў. Апрача таго, у гэтыя раёны камандыруюцца ўпаўнаважаныя НКФ тэрмінам на 2 дэкады для дапамогі мясцовым арганізацыям.

Удзельнікі нарады заключылі дагавары сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне мабілізацыі сродкаў у трэцім квартале і на ліквідацыю прарываў. Плян мабілізацыі сродкаў у трэцім квартале павінен быць поўнасьцю выкананы ва што-б тан ні было.

Дабіцца карыснага зруху

Ліпеньскі плян мабілізацыі сродкаў па гор. Менску выкананы на 91 проц. Па асобных галінах работы ёсьць рад буйных прарываў. Так па ўцягненьні ўкладаў у ашчадкасы заданьне выкавана ўсяго на 65 проц. Гэта тлумачыцца тым, што касы ашчаднасьці нічога ня робяць для вярбоўкі новых укладчыкаў.

У справе рэалізацыі акцый Трактарацэнтру пануе поўны самацёк. Месячнае заданьне выканана толькі на 63 проценты.

Плян пазнакапленьня па ЦРК і ЗРК выкананы за месяц усяго на 31,6 проц., а па райспажыўсаюзе — на 47,3 проц.

У Менскім раёне не разгорнута масава - агітацыйная работа аб датэрміновай уплаце падатку і страхоўкі. Заданьне па спагнаньні с.-г. падатку за ліпень выкананa на 18,2 проц., па страхоўцы — на 42,6 проц.

Партыйныя ячэйкі і сельсаветы Менскага раёну аддаюць мала ўвагі мабілізацыі сродкаў.

Неабходна поўнасьцю ліквідаваць прарывы па ўсіх галінах фінпляну, рашуча ўдарыўшы па настроях самацёку і апартуністычнай недавацэнцы мабілізацыі сродкаў.

ЭЛЬПЕРЫН.

Загадчык Янаў ловіць рыбу

У Шклоўскім раёне некаторыя сельсаветы да гэтага часу на атрымалі яшчэ акладных лістоў. Ліпеньскае заданьне па зборы с.-г. падатку сарвана. Ня лепш стаіць справа і з іншымі галінамі фінпляну, як напрыклад, рэалізацыяй акцый Трактарацэнтру, паякапленьнем і інш.

Загадчык райфа ЯНАЎ амаль зусім ня бывае на рабоце, а ходзіць на рэчку купацца і павіць рыбу. Прыкладу «зава» сьледуюць і некаторыя іншыя работнікі. ТРЭБА ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ КАНКРЭТНЫХ ЗРЫЎШЧЫКАЎ ФІНАНСАВАГА ПЛЯНУ.

Я.

Церахаўшчына адстае

У Церахаўскім раёне пазыка на вёсцы рэалізавана ўсяго на 26,8 проц., прычым падпіска ў ашчаднасобным сэктары складае 9,1 проц. заданьня. Райпрафсавет і раённая камісія садзейнасьці для ўзмацненьня кампаніі нічога ня робяць.

У дэкаду індустрыялізацыі павінен быць заваёван рашучы пералом. Заданьне па рэалізацыі пазыкі ў Церахаўскім раёне павінна быць выканана на 100 проц.

Гуінскі.

КААПЭРАЦЫЯ

ЗА ШЫЛЬДАИ „АБ'ЕКТЫЎНЫХ" ПРЫЧЫН

„РЭКОРДЫ" СТАЛОЎКІ № 24

У той час, як на набудове дому Акадэміі Навук лепшы ўдарнік Дворкін ставіць сусьветныя рэкорды кладкі цэглы, калі каменшчыкі і чорнарабочыя ахоплены высокім энтузіязмам сацыялістычнага будаўніцтва, сталоўка № 24 МЦРК пры набудове дому Акадэміі Навук стаіць «рэкорды» агіднага абслугоўваньня будаўнікоў і абыякавых адносін да іх патрэб.

У той самы дзень, калі тав. Дворкін паказаў тэмпы работы, якія перавышаюць у 24-25 раз звычайныя тэмпы каменшчыкаў, сталоўка паказала такія «тэмпы» ў гатаваньні абедаў, якія заслугоўваюць адпаўтолькі «ўзнагароды» —чорнай дошкі.

На абед было падана: рэдзенькая посная капуста, лыжка поснай-жа бульбы і два кавалачкі хлеба. Вось усё, чым «накармілі» ў той дзень будаўнікоў.

У чым-на справа? Чаму будаўнікі атрымалі такі дрэнны абед? Ці сапраўды не хапае прадуктаў ці вінаваты кіраўнікі сталовай?

Мы праверылі прычыны такой кепскай работы сталовай. І ўзгуніліся, што большай безадказнасьці за ёс сталоўкі, за якасьць абедаў—наўрад ці можна знайсьці.

Загадчыца сталов

На абарону гераічных палоньнікаў капіталу!

ЛЮТУЕ БЕЛЫ ТЭРОР У ЗАСЬЦЕНКАХ ФАШЫСЦКАЕ ПОЛЬШЧЫ

Год выданьня—XV
№ 217 (4122)
СЕРАДА, 12 ЖНІЎНЯ 1931 г.
Цана нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны
рэдактар—4-27,)—сакратар—10-74, партсэкстар—13-60, прамысл.—13-80, сац. земл.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-42, міжнародная інфармацыя—10-74, канторавыд-ва—81, адрэс. абвестак—7-31

Крывёю працоўных заліваюцца палі Зах. Беларусі і Зах. Украіны

Фізычнае зьнішчэньне рэвалюцыйнага авангарду—крок да інтэрвэнцыі супроць СССР

Прэч фашысцкі турэмны рэглямант

Польскі фашызм хоча маральна зламаць і фізычна зьнішчыць рэвалюцыйны авангард і з гэтай мэтаю побач з такімі страшэннымі злачынствамі, як «пацыфікацыя» Зах. Украіны, Луцку, Кобрыну, Ліда ўводзіць у турмах фашысцкі рэглямант.

Якая-ж мэта ўвядзеньня фашысцкага рэгляманту ў турмах? Шляхам увядзеньня гэтага дэфэнзыўна-паліцэйскага рэгляманту польскі фашызм імкнецца да скасаваньня катэгорыі палітычных зьняволеных, адабраньня ад іх рэштак правоў, якія палітзьняволеныя здабылі шматгадоваю ўпартаю і шматахвярнаю барацьбой, а іменна: да скасаваньня права прадстаўніцтва палітзьняволеных перад турэмнай адміністрацыяй і харчовай камуны. Фашысцкі турэмны рэглямант не прызнае абраных зьняволенымі старастаў, не дазваляе супольнай гаспадаркі і падзелу харчоў, скасоўвае камуны. Такім чынам, мэтай гэтага рэгляманту зьяўляецца — разьвіцьцё салідарнасьці паміж палітычнымі зьняволенымі, разьбіцьцё калектыву палітычных зьняволеных. Рэглямант ліквідуе бібліятэку палітзьняволеных. З бібліятэк выкідваюцца ўсе творы грамадзкага, палітычнага, гістарычнага зьместу, а таксама кніжкі на расійскай мове, гэта значыць 75 проц. усіх кніг, а рэшта кніг пераводзіцца ў агульную бібліятэку крымінальных.

Аднак, галоўным заданьнем фашысцкага рэгляманту зьяўляецца падзел зьняволеных паводле грамадзкага становішча, нацыянальнасьці, узросту, а таксама асьветы. Палякаў палітычных зьняволеных адлучаюць ад украінцаў, беларусаў ад яўрэяў, інтэлігенцыю ад рабочых, рабочых ад сялян, моладзь і таварышоў з меншай асьветаю адлучаюць ад больш адукаваных. Адміністрацыя падгаворвае слабейшых таварышоў да выступленьня з камуны, да даносаў і правакацый, абяцаючы ім перадтэрміновыя зьвальненьні з турмы (Ломжа, Вронкі, Горадня і г. д.). Палітычных зьняволеных в вялікіх прамысловых цэнтраў, як напрыклад Варшава, Лодзь, Дамброўскі басэйн, высылаюць у Пазнань, украінскіх, беларускіх сялян у карэнную Польшчу і г. д. Большую частку палітзьняволеных, барбарскі скатаваных у Луцкай дыфэнзыве восеньню мінулага году, выслана ў Плоцк, Ломжу, Седлец і Петракоў. Разьбіваецца турэмны актыў і самых актыўных, найбольш сьвядомых таварышоў турэмныя каты высылаюць у катаржныя турмы, пераважна ў адзіночныя цэнтралі ў Пазнані. Палітычных зьняволеных саджаюць разам з крымінальнымі і наадварот. Усё гэта сьведчыць аб імкненьні польскага фашызму да поўнай ліквідацыі катэгорыі палітычных зьняволеных. Пратэст зьняволеных супроць такога барбарства, турэмныя каты абвяшчаюць бунтам і для задушэньня яго выклікаюць паліцыю і пажарную каманду, як гэта было ў Перамышлі. Камэры палітзьняволеных былі заліты патокамі вады, самі палітзьняволеныя былі страшэнна зьбіты, а частка вывезена. Крывавыя набоі палітзьняволеных зьяўляюцца неадлучнай часткай фашысцкага рэгляманту. У Люблін, у адказ на пратэст супроць падзелу палітзьняволеных паводле нацыянальнасьці, адміністрацыя наладзіла крывавую пазьню. Палітзьняволеных турэмныя каты сьцягвалі за ногі па жалезных усходах, іх тапталі нагамі, білі. Цэлы рад зьняволеных харкае крывёю. Такая-ж самая крывавая лазьня была наладжана ў студзені бягучага году над палітзьняволенымі і ў Караноўскай турме, калі яны выступілі з пратэстам супроць дрэнных харчы. Незалежна ад гэтага, турэмная адміністрацыя сыстэматычна цынічна зьдзекуецца над палітзьняволенымі. Так, яна ўвяла па Сэрбію ў Варшаве пад асабісты агляд жанчын, бясспрэчна канфіскуе грашовыя сродкі зьняволеных, якія яны атрымліваюць ад сваякоў (турма ў Фордоне), недапускае з волі харчовых пасылак, карэспандэнцыі, спажаньняў з сваякамі і г. д. Адначасова з гэтым уведзена сыстэма пакараньня за самыя дробныя парушэньні «турэмных правіл» (кары за сталяньне пры акне, за ляжаньне днём на ложку і г. д.).

Шляхам жудасных катаваньняў, шляхам крывавых оргій фашызм хоча стэрарызаваць рабоча-сялянскія масы на свабодзе, хоча ізаляваць МОПР і антыфашысцкія арганізацыі ад мас. Пры дапамозе фашысцкага турэмнага рэгляманту, пры дапамозе дэфэнзыўна-турэмнай сыстэмы катаваньняў і нацыянальнага падзелу ён хоча разьбіць і з дэмаралізаваць авангард пралетарыяту ў турмах.

Толькі шырокая масавая кампанія пратэсту працоўных усяго сьвету зможа паралізаваць крывавыя пляны польскага фашызму па зьнішчэньні ў турмах авангарду рабочае клясы і працоўнага сялянства.

На зьверскія катаваньні, на крывавую оргію фашысцкіх інквізытараў, на фашысцкі турэмны рэглямант працоўныя масы БССР і усяго Савецкага Саюзу павінны адказаць магутнай хваляй пратэсту і ўзмацненьнем чырвонай дапамогі палоньнікам фашызму.

Прэч фашысцкі турэмны рэглямант!

ДА ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО СЬВЕТУ

Новым распараджэньнем фашысцкага ўраду Піпсудзкага палітзьняволеныя ставяцца ва ўмовы, якія да гэтага часу ўжываліся толькі ў адносінах да крымінальных.

У Польшчы палітычных зьняволеных, якія доўгія гады сядзяць у турме, налічваецца ТЫСЯЧЫ. У Польшчы палітычным злачынствам зьяўляецца ўсё тое, што зьяўлялася злачынствам і ў часы царскага ўраду. Аж па сёнешні дзень у краіне існуе стары царскі кодэкс, яшчэ больш пагоршаны новымі барбарскімі параграфамі. У былых прускіх і аўстрыйскіх правінцыях выкаплі параграфы часоў абсалютызму канца XVIII і пачатку XIX стагодзьдзяў, якія ўжо даўно ня ўжываліся ў Нямеччыне і Аўстрыі. У Польшчы выносіліся СЬМЯРОТНЫЯ ПРЫСУДЫ (львоўскія працэсы) за пашырэньне камуністычнай літаратуры, якія потым шляхам «ласкі» прэзыдэнта замяняліся 10-15 год катаргі. «Нармальны» прыгавор за палітычныя пераканаьні, за выказваньне пэўных поглядаў, за распаўсюджваньне іх пры дапамозе друку, выносіў 6-8 год катаргі. Такія пакараньні дзюцца часта нават хлапцом і дзяўчатам.

Царскі ўрад прызнаваў за палітзьняволенымі пэўныя прывілеі: звальненьне ад правіл турэмнага распарадку, якія зьнажалі людзкі гонар, уласная вопратка, кнігі і пісьмовыя прылады. Польскі ўрад, захоўваючы царскія законы, ужо гадамі імкнецца пазбавіць палітзьняволеных гэтых мізэрных «прывілей». У даны момант урад Піпсудзкага распарадзіўся зараз-жа і безагаворачна скасаваць гэтыя ільготы.

У Польшчы ня толькі за камуністычныя пераканаьні каруюць турмой. Тысячы беспартыйных рабочых і сялян сустракае такі-ж самы лёс за супрацьўленьне разьюшанай ФАШЫСЦКАЙ ДЫКТАТУРЫ Піпсудзкага, за абарону свайго кавалку хлеба, свайго жыцьця, свайго людзкога гонару перад гваптамі ўраду.

Апрача гэтага, ПОЛЬШЧА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ТУРМОЙ НАРОДАЎ.

40 проц. яе насельніцтва складаюць народы, якія гвалтам далучаны да Польшчы. Палітычныя дзеячы, якія змагаюцца за свабоду гэтых народаў, падзяляюць лёс рэвалюцыйнага пралетарыяту і сялянства. Прафэсар БРАНІСЛАЎ ТАРАШКЕВІЧ — змагар за справу вызваленьня беларускага народу, вельмі паважаны ў сваёй краіне і заграніцай, якога палітычная паліцыя здрадніцкі вырыставала ў міжнародным цягніку ў Паморскім каридоры, адседжвае 15 год катаргі.

Факты страшэнных катаваньняў, якія застасоўваліся да палітзьняволеных у турме г. Луцка (Заходняя Украіна), уліваньне вады і мачы ў нос, зьбіваньне жалезнымі палкамі па пятах, паманьне касьцей, згвалтаваньне жанчын, капчаньне папавых органаў — усе гэтыя факты вядомы ўжо усяму сьвету. Сотні падобных фактаў утойваюцца польскай прэсай і так званай грамадзкай думкай.

Распараджэньне аб ураўненьні палітзьняволеных з крымінальнымі азначае для тысяч палітзьняволеных БЯЗДОНЬНЕ КАТАВАНЬНЯЎ І СЬМЕРЦІ, бо крымінальныя ў Польшчы адданы на такую зьнявагу людзкой годнасьці, на такую МАРАЛЬНУЮ І ЎМЫСЛОВУЮ ДЭГРАДАЦЫЮ на якую палітзьняволеныя ніколі ня згадзяцца без барацьбы. Няроўнае змаганьне ў турэмных карцарах, змаганьне палітзьняволеных супроць турэмных разбойнікаў, якое ўжо адбываецца ў цэлым радзе турмаў, павінна пацягнуць за сабой вялікі лік ахвяр, калецтва і сьмерць. Найменшы пратэст — гэта «бунт», гэта біцьцё, катаваньне і забойства зьняволеных. Іх апошняя зброя — ГАЛАДОЎКА — гэта «прымусовае кармленьне» польска-фашысцкім мэтадам: паліцэйскія і наглядальнікі адкрываюць вслабеўшым зьняволеным вусны жалезным кручком, раняць і разрываюць горла і кішкі ўбіваючы ў іх мэталёвыя трубы з мэтай уліцьця корму. Гэта страшэнная барацьба на жыцьцё і сьмерць усё больш пашыраецца і перарастае ва ўсеагульную галадоўку палітзьняволеных у Польшчы.

КАТАВАНЬНІ І МАСАВЫЯ ЗАБОЙСТВЫ ШАЛЕЮЦЬ ВА ЎСІХ ФАШЫСЦКІХ ТУРМАХ ПОЛЬШЧЫ.

ТОЛЬКІ РАШУЧЫ ПРАТЭСТ НАЙШЫРЭЙШЫХ ПРАЦОЎНЫХ МАС УСЯГО СЬВЕТУ МОЖА ЎТРЫМАЦЬ КРЫВАВУЮ РАСПРАВУ КАТА ПІЛСУДЗКАГА НАД АБЯЗБРОЕНЫМІ ЗЬНЯВОЛЕНЫМІ. Да гэтага пратэсту, да актыўнага дэманстраваньня людзкой салідарнасьці заклікаем вас.

Пратэстуйце-ж шляхам масавых сходаў, прымайце рэзалюцыі пратэсту, дэманструйце на вуліцах. Шлеце масавыя пратэсты польскаму ўраду яго пасольствам і консульствам, польскай прэсе і прэсе вашай краіны, цэнтральнаму камітэту міжнароднай чырвонай дапамогі. Заклікаем усе органы прэсы, якія не прадаліся міжнароднаму капіталу, каб яны зьмясьцілі гэту адозву і падтрымалі кампанію пратэсту.

Дэманструйце так, каб прадстаўнікі фашысцкай Польшчы ў вашай краіне—гэтыя «знатныя» дыпляматы крывавай фашысцкай дыктатуры Піпсудзкага — пачулі вашу нянавісьць і абурэньне.

РАБОЧЫЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ! Не азірайцеся на вашых правадыроў, якія сьпяшаюцца з «пратэстамі» толькі тады, калі разам з міжнароднай буржуазіяй трэба ачарніць Савецкі Саюз. Пратэстуйце супроць злачынстваў польскага фашызму.

ЛІТАРАТАРЫ, АРТЫСТЫ, ВУЧОНЫЯ! Парвеце ўсякія зносіны з тэй урадавай польскай «культурай», якая пакрывае гэтыя крывавыя злачынствы, якая суўдзельнічае ў гэтым злачынстве. Яны стараюцца пазыскаць вашу прыхільнасьць, каб вашым імем пакрыць «культурную місію» фашысцкай Польшчы, крывавыя дзеяньні дыктатуры Піл судзкага.

Няхай ваш салідарны ПРАТЭСТ І БАЙКОТ будзе для іх адказам!

СЬПЯШАЙЦЕСЯ З ЧЫННАЙ ДАПАМОГАЙ.

Кожны дзень бязьдзейнасьці — гэта прыгавор сьмерці для многіх жывымі пахаваных у казэматах Луцку, Вронак, Рэйча, Лукішан, Коранава і Інш. «слаўных» катаваньнях фашысцкай Польшчы.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ПОЛЬШЧЫ.
ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЫ.
ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

„Мяне катавалі шэсьць тыдняў бязупынна"

Да ўсіх рабочых і работніц Беластоку

Таварышы! Калі паслы камфракцыі сойму ўносілі ў сойм інтэрпэляцыі аб катаваньнях палітзьняволеных паліцыяй, міністар юстыцыі падкрэсьліў у сваёй прамове, што паліцыя зусім ня б'е арыштаваных, што ўсе абвінавачаньні паліцыі — гэта подлая хлусьня.

Вось ліст палітзьняволенага в Беластоцкай турмы:

«Я быў затрыман на вуліцы трыма шпікамі, якія мяне павялі ў дэфэнзыву, дзе ад мяне патрабавалі, каб я прызнаўся, а таксама выдаў маіх таварышоў. Калі я адказаў, што ні аб чым ня ведаю, адзін агент сказаў: «Ты ў нашых крывавых руках, будзе табе канец, як Рэйхману». (Камуніст Рэйхман быў задушан беластоцкімі агентамі паліцыі). Разам з такой пагрозай я атрымаў некалькі аплявух, потым мяне сілаю распранулі, рушнікамі зьвязалі рукі і ногі і вядомы кат МІЛЬЛЕР заткнуў мне рот анучай і пачаў ліць ваду ў нос. Пры гэтым адзін агент сеў на жывот. Ліпі па чарзе, спачатку звычайную ваду, а пасьля сельцерскую. Калі каля 4-х гадзін раніцы скончылі мой допыт, увесь нос быў раскрываўлен. Шпікі са зьдзекваньнем і ўсьміханьнем гаварылі, што гэта толькі першае акрываўленьне. Праз некалькі гадзін мяне зноў пачалі катаваць. Калі я адказаўся даваць паказаньні, Мільлер зноў пачаў мяне мучыць. Ён мяне біў таўстым кавалкам гумы па пятах, у грудзі, разаў за валасы і біў галавой аб падлогу, жалезнай палкай біў па бакох. Калі гэта не дапамагло, ён зноў пачаў ліць ваду. Такім чынам мяне катавалі шэсьць тыдняў бязупынна. А калі я, спасылаючыся на пасьведчаньне турэмнага доктара, які канстатаваў сінякі і раны на целе, напісаў скаргу аб маіх катаваньнях, судзьдзя-сьледчы сказаў: «Гэта плётні. Паліцыя ня б'е».

«У турме пасьля гэтага на працягу трох тыдняў з роту і носу ў мяне ішла кроў, я адчуваў страшэнную боль у сэрцы».

Тое, што перажыў таварыш, які пісаў гэты ліст, будучы ў крывавых лапах беластоцкай дэфэнзывы, перажывае амаль кожны рабочы і селянін, арыштаваны, з прычыны барацьбы за вызваленьне з-пад цяжкага фашысцкага ярма.

Гэты ліст—гэта толькі адно маленькае зьвяно ў ланцугу катаваньняў і бандыцкіх сродкаў, якія ўжываюцца фашысцкай дыктатурай у барацьбе супроць рэвалюцыйнай часткі пралетарыяту, гэта далейшы працяг Луцку, Лодзі, Чэнстахова, Ліды, Кобрына, працяг «пацыфікацыі» Зах. Украіны. Крывавыя каты фашысцкага ўраду адчуваюць, што іх панаваньне ўжо набліжаецца да канца. Клясава сьвядомыя масы, якія ўжо на раз паказалі, што яны гатовы ахвяраваць сваё жыцьцё для выратаваньня працоўных з фашысцкіх подлых кіпцюроў, прымушаюць буржуазію, якая пераджаецца, рабіць апошнія намаганьні, каб выратаваць з роспачлівага становішча. Тэрорам, катаваньнямі рабочых і сялян, сотнямі гадоў турмы, гвалтам над жанчынамі буржуазія імкнецца запалохаць працоўныя масы і адцягнуць іх увагу ад рашучай барацьбы за лепшую будучыню.

20 сакавіка г. г. акруговы суд Беластоку засудзіў 8 маладых рабочых, яшчэ амаль дзяцей, на турэмную катаргу ад 4 да 6 год.

Рабочы і селяніне! Цяпер ўсё гэта табе не паказвае, што больш чакаць нельзя. Мацеры і сёстры зашлі 10 тысяч палітарыштаваных! Выходзьце на вуліцы! Станавецеся пад сьцяг рэвалюцыйнай часткі пралетарыяту! Разам з усім пралетарыятам пакажэце катам і забойцам, вашых мужаў, сыноў і братоў, што барацьба рашучая, што лішто, нават сотні год турмы і страшэнныя катаваньні ня ў стане вас адарваць ад барацьбы за вызваленьне рабочае клясы, і працоўнага сялянства, за рабоча-сялянскі ўрад. Прэч катаваньні безабаронных палітзьняволеных!

Прэч контр-рэвалюцыйную вайну супроць Савецкага Саюзу!

Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя!

Няхай жыве чырвоная дапамога Заходняй Беларусі!

Беластоцкі Камітэт МОПР'а.

"На дапамогу вашым братом і сёстрам"

Да рабочых і работніц Горадні

Таварышы! Учарашняй ночы крывавыя турэмныя каты і паліцыя напалі на палітычных зьняволеных. Чуеце, таварышы, заклік вашых братоў і сясьцёр аб выратаваньні? Ці дазволіце, таварышы, зьдзекавацца над нашымі братамі? Бо толькі-ж вы, таварышы, цеснымі радамі, магутным пратэстам можаце абараніць іх ад зьдзекоў і пабояў, ад сьмерці. Яны-ж, як былі на волі, змагаліся за рабочую справу, за вашы патрэбы і за гэта фашысцкі крывавы ўрад усімі сіламі імкнецца замучыць іх у турмах, каб не вярнуліся яны ў вашы рады для супольнай барацьбы. Вы ня раз ужо вырывалі вашых таварышоў з рук паліцэйскіх катаў.

Таварышы беспрацоўныя! Няўжо вы будзеце бязьдзейна прыглядацца да таго, як зьдзекуюцца крывавыя каты над двумя сотнямі вашых таварышоў у турме? Ні аднаго-ж з вас чакаюць турэмныя казэматы за абарону сваіх правоў на жыцьцё, у барацьбе за хлеб і работу. На дапамогу, таварышы, палітычным зьняволеным, на дапамогу вашым братом і сёстрам!

Таварышы рабочыя і работніцы Горадні! Камуністычная партыя заклікае вас на дэманстрацыю ў абарону палітычных зьняволеных. Усе на вуліцу! Усе—да турмы!

ПРЭЧ ФАШЫСЦКІ ЎРАДІ ПРЭЧ КРЫВАВЫХ ФАШЫСЦКІХ КАТАЎ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ПРАЛЕТАРСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ РАБОЧА-СЯЛЯНСКІ САВЕЦКІ ЎРАД!

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ!

ГОРАДЗЕНСКІ АКР. КАМ. КПЗБ.

Паведамленьні

Усім рэдкалегіям насьценных газэт і шматтыражак

12 жніўня ў 7 гадзін увечары, у памяшканьні Дому Камасьветы (пакой, № 19, уваход з вуліцы Энгельса) адбудзецца грунавая кансультацыя для членаў рэдкалегій насьценных газэт і шматтыражак па пытаньні арганізацыйнай работы рэдкалегій і выпуску штодзённкі. Дакладчык нам. рэдактара газэты «Рабселькор» тав. Вержбаловіч. Просьба зьявіцца своячасова.

— Менгарком КП(б)Б і Менгарсавет СВБ склікае на 12 жніўня, у 7 гадз. веч., у памяшк. Дому Камасьветы, пакой № 18, інструкцыйную нараду па правядзеньні чарговай антырэлігійнай кампаніі. На нараду павінны зьявіцца т. т., якія прымацаваны да прадпрыемстваў для правядзеньня там дакладаў: зав. імя Варашылава—Прыпц («Орка»), «Камунар»—Віткоўскі (БАН), шчацінная фабрыка—Камінская («Орка»), абутковая ф-ка—Буткевіч (БАН), зав. «Бальшавік»—Вітлін (ЦК КП(б)Б), ф-ка «Беларуска»— Сяліцкі (Польпэдтэхнікум), «Чырв. Тэкстыльшч.»—Вішнеўская (Гар. КК), абутковая майст.—Булат (33 школа) каўбасная ф-ка—Арцюшэўскі, ф-ка імя Крупскай—Гараўскі («Орка»), ф-ка «Кастрычнік»—Зарэмскі (Наркамасьветы), зав. «ДА»—Мэтэ (Польпэдтэхнікум), друк. імя Сталіна— Раманоўскі («Орка»), шпалерная ф-ка—Губер (Наркамасьветы), чыгунка—Клыс (Дзяржплян), шклозавод—Раткевіч («Орка»), Эльвод—Кавальскі (Эльвод), «Камунарка»—Шыманская (Польклюб).

— 12 жніўня ў 7 гадзін вечара, у памяшканьні Дому Чырвонай армії склікаецца агульна-гарадзкі актыў Асоавіяхіму г. Менску. Парадак дня: 1. Выніці Пленуму ЦС Асоавіяхіму СССР. 2. Аб грамадзянскай авіяцыі. 3. Мастацкая частка. Яўка актыву абавязкова пад адказнасьць сакратароў яч. АСО.

—Нарада, скліканая ЦКК-НКРСІ Бел. па пытаньні радыё-будаўніцтва на 11 жніўня г. г., пераносіцца на 13-га жніўня у 6 гадз. вечара, у памяшканьні ЦКК-НКРСІ Бел., 3-ці паверх, пакой № 12.

— Сад Працасьветы. Сёньня, у 8 гадз. веч. адбудзецца вечар сумесна з наглядкамі Леніна і Розы Люксэмбурга, прысьвечаны дню індустрыялізацыі. Парадак дня: 1) Даклад. 2) Мастацкая частка. Уваход для асьветнікаў па членскіх білетах.

У выпадку дрэннага надвор'я, вечар пераносіцца ў Дом Асьветы.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

СПЕРМОКРИН
ДЗЯРЖ. ІНСТЫТУТ ЭКСПЭРЫМЭНТАЛЬНАЙ ЭНДАКРЫНАЛЁГІІ НАРКАМ ЗДАРОЎЯ
Даведкі і паказаньні да ўжываньня высылаюцца па першым запатрабаваньні дармова.
Цана 1 фляк. 30 гр.—1 р. 50 к.
„ 1 фляк. 50 гр.—2 р. 80 к.
„ 1 кар. у ампул.—1 р. 50 к.
„ табл. 1 фл. 25 шт.—1 р. 25 к.
ПРОДАЖ ВА ЎСІХ АПТЭКАХ І МАГАЗЫНАХ САН. І ГІГІЕНЫ
Пры адсутнасьці ў магазынах, аптэках, заказы і задаткі накіроўваецца—„Москва, Москворецкая, 26. Гум.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
У ШКОЛУ ФЗВ СУВЯЗІ
ПРАЦЯГВАЕЦЦА да 1-IX-31 г.
Аддзяленьні: тэлеграфнае, тэлефоннае і радыё
Рыхтуе кваліфікаваных мацэраў сувязі
Прымаюцца асобы з адукацыяй 7-мігодкі. Курс навучаньня 2 гады.
Стыпэндыяй забясьпечваюцца на першым курсе ўсе залічаныя. Разьмер стыпэндыі на першым курсе 24 руб.
Заявы накіроўваць: Менск, Ленінская вул. д. № 36
ДЫРЭКЦЫЯ

БЕЛІЛЬНАКАНАЛЛЯВОДБУД
ЗАПРАШАЕ на пастаянную работу галоўнага бухгальтара і бухгальтароў.
Аклад па згодзе.
Зварачацца: Савецкая, 71, 3-ці паверх, пакой № 25, тэл. № 17-16.

Менская музычная школа
аповяшчае НАБОР ВУЧНЯЎ
па наступных дысцыплінах: духавыя, народныя сьпевы віяланчэль,
Заявы прымаюцца ў канцылярыі школы (Камсамольская, 19) з 10 па 29 жніўня.

„КУЛЬТУРА" Пач. 7, 8-45, 10-30 — БУЙНЫ КАСТАЦКІ ФІЛЬМ ДЗЯРЖАЎНЫ ЧЫНОЎНІК у гал. ролі—РАГОЖЫН
Інтэрнацыянал Пач. 1 с. у 7 г. в. — Тры мушкецёры паводле раману Дюма ў 12 частках у гал. ролі ДУГЛАС ФЭРБЕНКС.
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — 10 жніўня—адкрыцьцё 1) „Сілі пачуцьця" у 7 частках. 2) „Па ленінскім шляху" Пачатак у 2 гадз. дня.
„СПАРТАК" Пач. у 7, 9, 11 Каса—з 5 гадз — САЛАМАНДРА Драма ў 7 частках

СЁНЬНЯ, 12 жніўня, у 7 гадз. веч., у памяшканьні Дому Чырвонай армії склікаецца АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ АКТЫЎ АСОАВІЯХІМУ гор. Менску.
Парадак дня: 1) Выніці пленуму ЦС Асоавіяхіму СССР. 2) Аб грамадзянскай авіяцыі. 3) Мастацкая частка. Яўка актыву пад адказнасьць сакратароў ячэек Асо абавязкова.
Гарсавет Асоавіяхіму.

Прыём заяў у БЕЛАРУСКІ ТАРФЯНЫ ІНСТЫТУТ ПРАЦЯГНУТ да 1 верасьня.
Умовы прыёму надрукаваны у „Зьвязьдзе № 183 (4087) ад 9 ліпеня г. г.
Дырэкцыя інстытуту.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ".
адкрыта з 12 гадз. дня.
З 12 жніўня
мастацкі фільм
з Жыцьця І. С. ТУРГЕНЕВА
АСЯ
У гал. ролі Н. Хахлоў, І. Валодзька.
Засл. арт. Н. Скарская.
Засл. арт. К. Якаўлеў.
Засл. арт. Карчагіна-Александроўская
Пачатак дзённых сэансаў у 2 г. і 3-45 м., вечэрніх—7, 8-45 і 10-30.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
у школу кааперацыйнага вучнеўства МЦРК
ПРАЦЯГНУТ да 25 жніўня.
Праводзіцца прыём на аддзяленьні: рахункова-бухгальтарскае (прымаюцца асобы, скончыўшыя 6-7 груп 7-годкі, узрост 15-18 год), прыгаварнае і спажывецкае (скончыўшыя 5 груп 7-годкі, узрост 14-17 год.
Тэрмін навучаньня 2 гады.
Усе залічаныя вучні забясьпечваюцца стыпэндыяй.
Заявы прымаюцца ў канцылярыі школы: Савецкая, 83, 2-гі паверх (уваход са двара) з 10 да 1 г. дня.
Адміністрацыя школы.

Гарпрафсавет і сэкцыя грамадзкага харчаваньня
склікае на 14-га жніўня (пятніца), у 6 гадз. дня, у памяшканьні залі гарсавету (3-ці пав.)
ПАШЫРАНУЮ НАРАДУ ўсіх работнікаў сталовак гор. Менску:
загадчыкаў, намесьнікаў, кухароў і кладаўшчыкоў.
На гэтай нарадзе абавязкова павінны ўдзельнічаць адказныя прадстаўнікі. ЗРК, ЗВК, ТПО, Белкапхарч, Плодагародніны, Наркамснабу, Гаркамсаюзу, Савінспэкцыі, ВСНГ, рэдакцый газэт, ЦП саюзу нархарч з усіх групкомаў і сталовых камісій.
З прычыны вобсабай важнасьці масавага агляду грамадзкага харчаваньня,—яўка на гэту нараду павінна быць своячасова і абавязкова.
Менгарпрафсавет.
Сэкцыя грамадзкага харчаваньня.

Усебеларускае аддзяленьне Акц.-Т-ва „ВЗОК"
запамінае
Ўсім заінтэрэсаваным арганізацыям аб неабходнасьці ў сувязі з апублікаваньнем праўленьнем Акц. Т-ва «ВЗОК» абвесткі ў газ. «За індустрыялізацыю» ад 22-VII за № 200-2915, прадставіць весткі аб сваёй патрэбе ў ВАДАМЕРАХ І НЕФЦЕМЕРАХ з запаснымі часткамі на 1932 год.
не позьней 15 жніўня г. г.
Прэйскурант на вадамеры і нефцемеры можна атрымаць у канторы аддзяленьня штодзённа ад 9 да 4 гадз. (акрамя выхадных дзён). Адрас аддзяленьня: пляц Волі, 13.
Усебеларускае аддзяленьне Акц. Т-ва „ВЗОК".

Агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б разам з рэдакцыяй часопісі „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА"
склікае
на 13 жніўня, у 6 гадзін вечара, у памяшканьні агітмасавага аддзелу ЦК
ПАШЫРАНУЮ НАРАДУ
прадстаўнікоў бытав. камітэту ЦВК, ВСНГ, НКАсьветы, НКЗ, ЦСПСБ. Дзяржпляну, Наркампрацы, Белмылсаюзу, Гаркамсаюзу, Гарсавету, Гаркому, ф-кі „Кастрычнік", „Камунаркі", „Беларускі", шчотачнай ф-кі, абутковай, „Бальшавік", рымарнай разам з актывам ударніц часопісі.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Становішча абслугоўваньня работніц розных прафэсій дзіцячымі ўстановамі; ход будаўніцтва новых дзіцячых устаноў і далейшыя перспэктывы.—Даклад ВСНГ. Суадклад ЦСПСБ.
2. Арганізацыя дзіцячых устаноў па жнівах і будаўніцтва іх пры новых домах.—Даклад Белмылсаюзу.
3. Рэгартаваньне бытав. сеткі ў калгасах і саўгасах далейшыя перспэктывы.—Даклад Калгасцэнтру. Суадклад бытав. камісіі ЦВК.
4. Рэарганізацыя работы яслей і садоў, прыстасаваньне іх да ўмоў працы работніц.—Даклад НКАЗ, суадклад НКАсьветы.
5. Аб дашкольнай кааперацыі.
Просьба да ўсіх вышэйназваных устаноў прыслаць сваіх прадстаўнікоў.
Агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б.
Рэдакцыя часопісі „Беларуская работніца і сялянка".

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
З 12 жніўня
)—(прыгодніцкі фільм)—(
у 3-х сэрыях і 21 частцы
11 частак (першая палова) у адзін сэанс.
МІС МЭНД
у гал. ролі—Ігар ІЛЬЛІНСКІ
В. Фогель.
Пачатак 1 сэансу ў 7 г., 2—8-45 м., 3—10-30 м.
Каса адкрыта з 5 гадз.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

ва Усебеларускі палітыка-асьветны інстытут на 1931-32 НАВ. ГОД

Палітыка-асьветны інстытут мае мэту падрыхтаваць палітасьветных працаўнікоў з вышэйшай кваліфікацыяй па асобных галінах палітасьветнай працы.

У адпаведнасьці з гэтым ПРЫ ІНСТЫТУЦЕ ІСНУЮЦЬ СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ АДДЗЯЛЕНЬНІ; 1) Арганізацыйна-інструктарскае. 2) Бібліятэчнае. 3) Масавай палітыка-асьветнай працы.

На 1-шы курс бяз іспытаў прымаюцца асобы, скончыўшыя курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ, ВТНУ, тэхнікумы, э-годкі, ФЗВ і інш. раўнажныя ім навучальныя ўстановы. Усе іншыя павінны трымаць іспыты ў аб'ёме ведаў сярэдняй школы.

У палітыка-асьветны інстытут на аддзяленьні арганізацыйна-інструктарскае і масавай палітыка-асьветнай работы прымаюцца партыйцы і камсамольцы, якія маюць ня менш, як 2-гадовы стаж актыўнай партыйнай, камсамольскай або грамадзкай працы.

На бібліятэчнае аддзяленьне прымаюцца і беспартыйныя з 2-гадовым стажам грамадзкай працы.

Узрост паступаючых ад 17—35 год.

У інстытут ня прымаюцца асобы з заразьлівымі хваробамі, хворыя псіхастэніяй у клінічнай форме, сухотамі і зусім фізычна слабыя.

Паступаючыя ў палітыка-асьветны інстытут павінны падаць на імя раённых і гарадзкіх камісій, што існуюць пры райкомах і гаркомах КП(б)Б, заяву з паказаньнем аддзяленьня і далучыць наступныя дакументы: 1) аб узросьце, 2) адносінах да ваінскавай павінасьці (адбітак), 3) аб асьвеце, 4) аб стапе адароўя, 5) аб сац. і матар'яльн. становішчы паступаючага і яго бацькоў, 6) аб выбарчых правах паступаючага і яго бацькоў, 7) для калгасьніка — даведку ад калгасу, а для аднаасобнікаў—адведны дакумант аб с.-г. падатку на 1931 г., 8) даведку аб 2-гадовым практычным стажы (для асоб, скончыўшых тэхнікумы і прафшколы), 9) характарыстыку мясцовай партыйнай або камсамольскай ячэйкі, 10) анкету, засьведчаную савецкімі або праф. установамі і арганізацыямі раённага маштабу, 11) дзьве фота-карткі і на 50 к. паштовых марак для адказу. Дакументы аб асьвеце дасылаюцца толькі ў арыгіналах; форма анкеты тая-ж, як і для ўсіх вышэйшых навучальных устаноў.

Праца адборачных камісій пры райкомах і гаркомах КП(б)Б павінна быць скончана да 1 верасьня. Сьпісы камандыраваных з усіх дакументамі дасылаюцца райкомамі і гаркомамі КП(б)Б палітыка-асьветнаму інстытуту не пазьней, чым да 10 верасьня на адрасе: г. Магілеў, п/Д. Камсамольская, 23.

З 15 па 20 верасьня праводзяцца іспыты.

Усе залічаныя студэнты інстытуту забясьпечваюцца інтэрнатамі, стыпэндыяй, пасьцельнай бялізнай, падручнікамі і пісьмовымі прыладамі.

Інстытут не бярэ на сябе ніякіх абавязацельстваў па прадстаўленьні кватэр сем'ям студэнтаў.

Для канчатковага залічэньня студэнтаў пры інстытуце ўтвараецца камісія.

Прыём на 1-шы курс інстытуту ўстанаўляецца ў ліку 60 асоб.

Райкомы і гаркомы КП(б)Б каманд ыруюць звыш нормы для лепшага адбору: Менскі, Віцебскі, Гомельскі—ня-ш, як на 4 ас